Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 155 (28265)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Кандыдатаў у жніўні лічаць**

СТАР. 2



**Газета і кава. Гэта модна!**

СТАР. 4



**Сведка вялікай эпохі**

СТАР. 10

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4,7 млрд**

*уклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі замежныя інвестары за студзень-чэрвень 2016 года (акрамя банкаў). Асноўнымі інвестарамі арганізацый краіны былі суб'екты гаспадарання Расіі (50,2% інвестыцый), Вялікабрытаніі (20,5%) і Кіпра (7,5%). Паступленне прамых замежных інвестыцый склала $3,9 млрд. У першым паўгоддзі арганізацыі Беларусі (акрамя банкаў) накіравалі за мяжу інвестыцый на суму 2 млрд долараў. Значныя аб'ёмы інвестыцый прызначаліся суб'ектам гаспадарання Расіі (51,8% ад усіх накіраваных інвестыцый), Украіны (21,9%), Вялікабрытаніі (14,6%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9555 ▼ |
| Еўра | 2,1797 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0779 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Пра Святое...

**Жнівеньскі дзень дагараў. На фоне амаль бясколерных нябёсаў сонца нагадвала цукерку-карамельку. Стрэлка на старым дарожным знаку паказвала на поўдзень. Сярод тысячы ўказальнікаў і знакаў на нашых дарогах мне ўпершыню патрапіўся гэты сакральны надпіс — Святое. Такое таямнічае, загадкавае слова! Яно клікала ў падарожжа, абяцала нечаканую сустрэчу, інтрыгавала: няўжо і сапраўды ў нас ёсць такая вёска?!**

**Знакавых мясцін, якія па праву называюць святымі, у нас нямала: цэрквы, касцёлы, кляштары, прошчы і могілкі, крыніцы, дрэвы, камяні... Ні сёння, ні ўчора — стагоддзямі намоленыя, яны грэюць нашы душы, даюць моц і надзею. У беларускай тапаніміцы ёсць некалькі прыкладаў, калі населеныя пункты называюцца Святымі. Чаму раней давалі такія назвы? Чым адметны і непаўторны кожны такі куточак? Упэўнены, людзі заўсёды будуць шукаць адказы на гэтыя пытанні...**

СТАР. 12






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Самая маладая сям'я ў вёсцы Святое — Віталь і Ірына ЗАХАРОШКІ і іх дачушка Аляксандра.

■ Рэпарцёр атрымаў заданне

# НЕ ПАЕЎ, АДКУЛЬ СІЛА БУДЗЕ?

## Як карэспандэнт «Звязды» карміла абедам хлебаробаў агракамбіната «Зара»

**Сёння ў вёсцы самая гарачая пара. Ураджай добры, трэба толькі хутка і якасна яго ўбраць. Хлебаробы выкарыстоўваюць кожную сонечную хвіліну, часу няма нават на паездкі ў сталовую. Таму гарачыя абеды для іх прывозяць проста ў поле. Карэспандэнт «Звязды» атрымала заданне хутка і якасна накарміць тых, ад каго залежыць харчовая бяспека нашай краіны. Магчымасць яго выканаць прадставіла адна з лепшых гаспадарак Магілёўскай вобласці — агракамбінат «Зара».**

СТАР. 3



Уладзімір Корсак: «Люблю панцак з падліўкай».

# А Я НА ФУРЫ ЕЗДЖУ!

## Дальнабой вачыма бландзінкі



**Траса. Фура. Дзяўчына. У Гродне жыве адзіная ў Беларусі бландзінка-дальнабойшчыца. Вераніка Рылоўцава ўтаймоўвае магістральны цягач не першы год, і тэхнічныя характарыстыкі машыны захапляюць яе не менш чым паказы мод. Стыльна апранутая дзяўчына развеяла стэрэатып пра дальнабойшчыка ў трэніках. Вераніка прабіла апошні бастыён сапраўднай мужчынскай прафесіі. Больш за тое — у свае 24 гады яна пабудавала на гэтым удалы бізнес. І здзіўленню няма межаў, калі дзяўчына расказвае пра свой унікальны шлях у дальнабой.**

СТАР. 7

## З ДНЁМ БУДАЎНІКА!

У нядзелю прафесійнае свята адзначаюць будаўнікі. Усіх работнікаў і ветэранаў гэтай сферы павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

«Будаўнічая галіна — адзін з найважнейшых сектараў беларускай эканомікі, таму для дзяржавы вельмі значна яго дынамічнае развіццё і дасягненне высокіх вынікаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі сёння на новым якасным узроўні ўзводзіцца жыллё, значна прасунулася наперад прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, а работнікі галіны занятыя на самых адказных аб'ектах у краіне і за яе межамі.

«Некалькімі пакаленнямі таленавітых беларускіх архітэктараў, праекціроўшчыкаў, будаўнікоў узведзена нямала іміджавых будынкаў — сімвалаў беларускіх гарадоў. І вядома, ваша праца дорыць людзям радасць наваселля, робіць іх жыццё больш добраўпарадкаваным і камфортным», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

■ Парламенцкі дзённік

## Прагноз росту ВУП налета складае 1,5%

**Гэтую лічбу агучыў намеснік міністра эканомікі Беларусі Дзмітрый Крутой на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах, якое адбылося ў пятніцу. Ён жа падрабязна расказаў аб складніках росту.**

— Галоўная задача прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2017 год — выхад на ўстойлівыя тэмпы эканамічнага росту, — паведаміў Дзмітрый Крутой. — Мы разлічваем, што тыя захады, якія сёлета распрацоўваюцца і прымаюцца, дадуць аддачу налета. Ужо распрацавана і структура прыросту валавога ўнутранага прадукту. Палову яго мусіць забяспечыць наша традыцыйная прамысловасць. Мы прааналізавалі вытворчыя праграмы буйных прадпрыемстваў. Усё рэальна, ніякай «маніла ўшчыны» ў іх няма. Інвестыцыйныя праекты, якія былі заяўлены дзяржаўнымі органамі, канцэрнамі і прыватным бізнесам, мусяць забяспечыць прырост ВУП на 0,6%. Да таго ж урад працуе над тым, каб задзейнічаць патэнцыял кітайскіх крэдытных ліній. Рэшту прыросту — 0,15% — мусяць забяспечыць 74 важнейшыя праекты інавацыйнай эканомікі.

Прырост ВУП адлюструецца і на росце даходаў. Прагназуецца, што ў 2017-м намінальны заробак павялічыцца на 11,8%, а рэальны — на паўтара працэнта.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Энергетычная бяспека

## КОРПУС РЭАКТАРА ЗАМЕНЯЦЬ

**Расійская карпарацыя «Расатам» згадзілася замяніць корпус рэактара першага энергаблока на Беларускай АЭС. Такое рашэнне было прынята пасля звароту беларускага Міністэрства энергетыкі, паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу карпарацыі.**

«Мы выканаем гэта патрабаванне заказчыка, яно было для нас чаканым, — цытуе прэс-службу кампаніі інфармагенцтва. — Мы ўжо заяўлялі, што паставімся да такога рашэння з павагай, разумеючы, з якой прычыны яно можа быць прынята, бо грамадская прымальнасць атамнай энергетыкі — не менш важны прыярытэт, чым яе бяспека. Будзем абмяркоўваць з заказчыкам дэталі, звязаныя з яго рэалізацыяй».

Нагадаем, раней некаторыя СМІ паведамлялі пра інцыдэнт, які быццам бы пашкодзіў корпус ядзернага рэактара. «Расатам» абверг гэту інфармацыю, зазначыўшы, што незапланаванае дакрананне корпуса да зямлі на невялікай хуткасці пры перамяшчэнні сапраўды мела месца, але ўсе праверкі і тэсты не выявілі пашкоджанняў. Тым не менш падчас рабочай паездкі ў Цюменскую вобласць Расіі **міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК** паведаміў, што міжведамасная камісія па будаўніцтве БелАЭС прыняла рашэнне аб замене корпуса рэактара першага энергаблока.

Пакуль не ўдалося атрымаць інфармацыю пра магчымыя пераносы тэрмінаў здачы аб'екта і павелічэнне фінансавых выдаткаў. У сваіх раней шых каментарыях **першы намеснік генеральнага дырэктара «Расатама» Аляксандр ЛОКШЫН** паведамляў, што ў выпадку, калі беларускі бок папросіць аб замене корпуса, на яго месцы будзе ўсталяваны корпус, які рыхтаваўся для другога энергаблока, што прывядзе да «некаторага зруху графіка завяршэння будоўлі энергаблока».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА

### як лакмусавая паперка, што характарызуе настрой жыхароў краіны

**У Магілёве ўчора прайшла нарада па актуальных пытаннях сацыяльнага развіцця, у якім прыняла ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.**



Паводле яе слоў, падобныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, у семінары-нарадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, культуры, спорту і турызму, інфармацыі, намеснікі старшынь гарайвыканкамаў па сацыяльных пытаннях, кіруючыя работнікі аблвыканкама, якія курыруюць гэты напрамак.

«Праводзячы семінар, мы не імкнуліся даць станоўчую або адмоўную ацэнку рабоце кадраў Магілёўскай вобласці — тэзісна вызначылі асноўныя напрамкі, якія дапамагаюць рухацца ва ўнісон з праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на бліжэйшыя пяць гадоў», — адзначыла Наталля Качанава. Паводле яе слоў, сацыяльная сфера — гэта своеасаблівая лакмусавая паперка, што характарызуе настрой жыхароў краіны. Наталля Качанава лічыць, што кадравы патэнцыял павінен грунтавацца на амаладжэнні і моцным рэзерве. «Хтосьці можа быць толькі добрым выканаўцам, а ў кагосьці пераважаюць лідарскія якасці. Гэта трэба бачыць, каб правільна працаваць у прафарыентацыйным напрамку», — лічыць віцэ-прэм'ер.

Яна выказала меркаванне аб неабходнасці ўдасканалення падыходаў да выдачы мэтавага накіравання на навучанне. Пры афармленні такіх дакументаў у прыярытэце павінны быць мясцовыя навучальныя ўстановы і замацаванне кадраў у сельскай мясцовасці. «Атрымліваючы адукацыю ў Мінску, маладыя людзі імкнуцца ўсімі магчымымі метадамі застацца ў сталіцы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — У першую чаргу трэба даваць накіраванні ў рэгіянальныя ВНУ, арганізоўваць практыку ў мясцовых арганізацыях, каб у перспектыве не ўзнікала праблем з замацаваннем маладых спецыялістаў у раёнах».

Намеснік прэм'ер-міністра зрабіла акцэнт на фарміраванні здаровага ладу жыцця. Гэта работа павінна быць актывізавана, асабліва ў сферы прафілактыкі. «Праблема алкагалізму закранае жыццё многіх сем'яў, і яны павінны ведаць, як папярэдзіць развіццё гэтай хваробы ў блізкіх людзей, да каго звярнуцца па дапамогу, — адзначыла Наталля Качанава. — Тут важна задзейнічаць усе магчымыя рэсурсы, у тым ліку грамадскія і рэлігійныя арганізацыі».

Нагадала Наталля Качанава і аб важнасці захавання парадку на аб'ектах сацыяльнай сферы: установы адукацыі, аховы здароўя, культуры павінны выглядаць дастойна, паколькі гэта цэнтры прыцягнення насельніцтва, асабліва ў райцэнтрах.

Была звернута ўвага на індывідуальны падыход у рабоце са зваротамі грамадзян. Намеснік прэм'ер-міністра ўпэўнена, што любое пытанне (акрамя тых, якія датычацца ўнясення паправак у нарматыўныя прававыя акты) можна вырашыць на месцах. На яе думку, тут важна ўзмацніць дзеянні на апярэджанне, а таксама палепшыць тлумачальную работу з насельніцтвам.

**Лідзія ЯРМОШЫНА:** ■ Выбары-2016

# «Кандыдат не павінен баяцца адкрытых пытанняў»

**Стала вядома, колькі ж чалавек прэтэндуе на 110 дэпутацкіх мандатаў. Як паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА, камісіі з вылучаных 630 зарэгістравалі 521 кандыдата. 93 прэтэндэнты атрымалі адмову ў рэгістрацыі, 16 — адмовіліся самі.**



### Адмоў у рэгістрацыі менш, чым у 2012-м

Каментуючы гэтыя звесткі падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА, Лідзія Ярмошына падкрэсліла: тут ніколі нельга кіравацца толькі лічбамі. Самае галоўнае, па яе словах, прычыны адмоў у рэгістрацыі.

— Калі адмовы абгрунтаваныя і адпавядаюць рэаліям, то гэта нармальна, — упэўнена старшыня Цэнтрвыбаркама. — Калі ёсць адмовы, «прыцягнутыя за вушы», будуць разбіраца тэрытарыяльныя камісіі, потым суды. Зразумела, такая сітуацыя не можа задавальняць ні мяне, ні выбаршчыкаў.

Паказальна, што сёлета было зафіксавана на 10% адмоў у рэгістрацыі менш, чым падчас парламенцкіх выбараў 2012 года. Так, тады было зарэгістравана 363 кандыдаты, а адмову ў рэгістрацыі атрымалі 122 прэтэндэнты.

### Усё індывідуальна

Адказваючы на пытанне, як яна асабіста ставіцца да таго, што кандыдаты адмаўляюцца ад удзелу ў дэбатах, Лідзія Ярмошына заявіла:

— Удзел у выбарах з'яўляецца свабодным, як і ў перадвыбарчых мерапрыемствах. Я супраць любога прымусу. Калі кандыдат адмаўляецца ад удзелу ў тэледэбатах, то выбаршчык мае права зрабіць адпаведную ацэнку яго асобы. Можа, ён адмаўляецца цалкам абгрунтавана? Напрыклад, кандыдат канкуруе з чалавекам, для якога характэрна залішняя канфліктнасць. Прыйсці і быць абражаным, прыніжаным, абляным — гэта роўныя ўмовы вядзення дэбатаў? Зразумела, што не. Я лічу, любы кандыдат (скажам, старшыня райвыканкама, кіраўнік, палітык) не павінен баяцца адкрытых пытанняў, павінен умець адкрыта апаніраваць. Але гэта вельмі індывідуальна.

### 63% зарэгістраваных вылучаны партыямі

Сярод зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — 24,8% жанчын.

Гэта менш за трэцюю частку ад агульнай колькасці, але ўсё-такі ў кандыдатаў-жанчын ёсць рэальны шанц заняць значную долю месцаў у ніжняй палаце парламента.

— Жанчыны могуць заняць і да 50% са 110 месцаў у парламенце, калі яны будуць абраныя выбаршчыкамі, — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Што да іншай статыстыкі, то моладзі сярод зарэгістраваных кандыдатаў 9,8% (крыху больш, чым у 2012 годзе, калі гэты паказчык склаў 9,1%). А 42 чалавекі (8,1%) — пенсіянеры.

Прадстаўнікі сацыяльнай сферы (адукацыя, культура, навука, ахова здароўя) склалі 18,2% (95 чалавек), прадстаўнікі дзяржорганаў — 9,8% (51 чалавек). Досыць шмат работнікаў прамысловасці — 17,3% (90 чалавек). Ёсць і прадпрымальнікі — іх 35 чалавек (6,7%). Іншыя сферы дзейнасці прадстаўляюць 136 чалавек (26,1%). У якасці кандыдатаў зарэгістраваны таксама і 31 беспрацоўны (6% ад агульнай колькасці зарэгістраваных).

Вылучаны палітычнымі партыямі і зарэгістраваныя ў якасці кандыдатаў 52,5% усіх зарэгістраваных (гэта прыблізна, як і ў 2012 годзе). У цэлым жа членамі партый з'яўляюцца 63,7% кандыдатаў (332 чалавекі).

### Заканадаўчыя, арганізацыйныя і прававыя ўмовы — роўныя

Пра гэта заявіла Лідзія Ярмошына, адказваючы на пытанне, ці былі створаны роўныя ўмовы для вылучэння апазіцыйных і праўладных кандыдатаў. Разам з тым старшыня ЦВК падкрэсліла, што абсалютнай роўнасці пры вылучэнні быць не можа, таму што не роўныя самі кандыдаты.

— Дырэктара завода вылучыць яго працоўны калектыў, кіраўніка грамадскага аб'яднання або лідара партыі падтрымае яго структура, а беспрацоўнага вылучаць няма каму, — звярнула ўвагу старшыня Цэнтральнай камісіі. — Таму абсалютнай роўнасці не існуе. Усё вызначае асоба самога кандыдата.

### Экзітполы на парламенцкіх выбарах не маюць сэнсу

Адказваючы на пытанне пра экзітполы на гэтых парламенцкіх выбарах, старшыня Цэнтральнай камісіі адзначыла, што не чакае, што на бягучых выбарах будуць праводзіцца экзітполы.

— Экзітполаў я не чакаю, але могуць быць сацыялагічныя апытанні, — сказала яна. — Экзітполы на парламенцкіх выбарах наогул не патрэбныя, таму што экзітпол можа праводзіцца толькі ў межах адной са 110 выбарчых акруг. Гэта абсалютна нічога не дае, таму экзітпол, на мой погляд, недарэчныя нават пры нашай мажарытарнай сістэме. Што тычыцца сацыялагічных апытанняў, то яны павінны праводзіцца абавязкова — хоць бы для выбарчых камісій, якія ўжо змогуць арыентавацца на тое, каму аддаюць перавагу выбаршчыкі.

### Мажарытарная сістэма патрэбна выбаршчыку

Падчас анлайн-канферэнцыі старшыню ЦВК запыталі і пра тое, ці можа вялікая колькасць членаў партый сярод зарэгістраваных у кандыдаты быць падставай для таго, каб разглядаць пераход да партыйных спісаў. Па словах Лідзіі Ярмошынай, пераход на прапарцыянальную сістэму патрэбен, каб партыі развіваліся, удзельнічалі ў выбарах.

— Гэта адзінае абгрунтаванне такога кроку, — сказала старшыня Цэнтрвыбаркама. — Але мы бачым, што партыі ў нас не дэградуюць, яны развіваюцца і пачынаюць удзельнічаць у выбарах яшчэ больш актыўна. Дык навошта мы будзем укараняць прапарцыянальную сістэму і ў той жа час пазбаўляць выбаршчыка такіх рэчаў, як персанальны погляд, персанальны выбар кандыдата, персанальная адказнасць? Гэта ўсё тое, што дае мажарытарная сістэма, што дорага выбаршчыку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**У разрэзе рэгіёнаў**

### НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ ЗАРЭГІСТРАВАНА 69 КАНДЫДАТАЎ...

Усяго за перыяд з 2 па 11 жніўня ў 13 акруговых камісіях Магілёўскай вобласці было пададзена 108 камплектаў дакументаў ад 85 патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Але толькі 69 з іх зацверджаны. Менш за ўсё прэтэндэнтаў на месца ў парламенце ў Крычаўскім раёне — 3 чалавекі. У трох акругах па 4 кандыдаты, яшчэ трох — па 5, чатырох — па 6 і ў дзвюх — па 7 і 8.

Як патлумачыў **старшыня абласной выбарчай камісіі Валерый БЕРАСТАЎ**, прычынамі выбыцця 16 патэнцыйных кандыдатаў сталі: у адным выпадку адмова ад удзелу ў выбарчай кампаніі, у астатніх — недакладныя подпісы ў падпісных лістах, пры выключэнні якіх не атрымлівалася неабходных 1000 галасоў для вылучэння ў кандыдаты, або недакладныя звесткі ў дэкларацыях, або няпоўны камплект дакументаў для рэгістрацыі.

Магчымасцю трапіць у кандыдаты 3 спосабамі — ад палітычнай партыі, працоўнага калектыву і шляхам збору подпісаў скарысталіся 4 кандыдаты, двума — 15 і адным — 50. З агульнай колькасці кандыдатаў у дэпутаты 58% — члены палітычных партый.

На 12 жніўня Магілёўскую вобласць наведалі 3 міжнародныя назіральнікі. Камісіямі ўсіх узроўняў акрэдытавана больш за 800 нацыянальных назіральнікаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### ...А НА МІНШЧЫНЕ — 66

Сярод іх 26 былі вылучаны шляхам збору подпісаў, 24 — працоўнымі калектывамі, 34 — палітычнымі партыямі. У тым ліку 10 — Ліберальна-дэмакратычнай партыяй, па 6 Камуністычнай партыяй Беларусі і партыяй БНФ, 5 — Аб'яднанай грамадзянскай партыяй, 3 —Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыяй (Грамада), 2 — Беларускай партыяй левых «Справядлівы свет», па 1 Рэспубліканскай партыяй працы і справядлівасці і Беларускай патрыятычнай партыяй.

Некаторыя прэтэндэнты на месца ў парламенце вылучаліся двума, а то і трыма спосабамі. У ліку кандыдатаў у дэпутаты, зарэгістраваных Мінскай абласной выбарчай камісіяй, 24 жанчыны (36,4%), 9 маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў (13,6%), 4 пенсіянеры (6,1%). Два чалавекі з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

У Мінскай вобласці для назірання за ходам выбарчай кампаніі і галасаваннем за кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў акрэдытавана 478 чалавек, сфарміравана 17 выбарчых акруг.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# НЕ ПАЕЎ, АДКУЛЬ СІЛА БУДЗЕ?


Уладзімір КОРСАК: «І што ў нас там на першае?»

## Як я стала кухоннай рабочай

Наогул у святая святых гаспадаркі, дзе гатуецца ежа для супрацоўнікаў агракамбіната, чужых не пускаюць. Таму спачатку праходжу атэстацыю ў генеральнага дырэктара таварыства Аляксандра Корнева, а заадно цікаўлюся, як ідзе бітва за ўраджай.

Кіраўнік мяне адразу ж папраўляе: бітвы няма, ёсць планавая работа. «Ураджай адпавядае тым параметрам, якія яму задавалі пры сяўбе, унясенні ўгнаенняў. Валавы збор будзе каля 23-24 тысяч тон, ураджайнасць каля 70 ц/га», — уводзіць ён мяне ў курс справы. Уборку ускладняюць ападкі, з-за якіх зарастаюць пасевы, а ад павышанай вільгаці ўтвараецца палеглась. Між тым механізатары поўныя аптымізму ўбраць усё своечасова і ў тэрмін. Яравыя і азімы рапс «заранцы» ўжо ўбралі, цяпер ідзе ўборка пшаніцы і трыцікале. На 10 жніўня было ўбрана каля 45% плошчаў, вал складаў больш за 10 тысяч тон. Калі надвор'е дазволіць, то праз 10 дзён жніво скончыцца. Потым пачнецца ўборка кукурузы і сяўба рапсу.

Вядомая справа, што ад таго, як людзей накормяць, залежаць і канчатковыя вынікі. З такім наказам я паступаю ў распараджэнне загадчыцы сталовай Яўгеніі Маісеенкі.

## Свежая капуста на першае, гуляш з пярлоўкай — на другое

Тэрыторыя гаспадаркі вялікая, і розныя аб'екты раскіданы па вёсках. Адміністрацыя, напрыклад, знаходзіцца ў Рэчках, а сталовая, дзе мне належыць дапамагаць варыць супы і кашы для механізатараў, у Хатках.

Першым чынам, калі мы прыязджаем на месца, мне выдаюць спецадзенне і хустку. Так я ператвараюся з карэспандэнта ў кухонную рабочую. Мне дазваляецца чысціць бульбу, перакручваць мяса на катлеты і гэтак далей. Чамусьці ўспомніўся фільм «Дзяўчаты». Але на ролю Тоні Кісліцынай я не падыходжу, яна спецыяліст, а я ж толькі вучуся. Таму на кухні я накшталт Тонінай сімпатыі — Ілы Каўрыгіна. Ціха радуюся, што цяпер ёсць вада ў кранах і яе не трэба вёдрамі насіць.

Яўгенія Маісеенка ў якасці загадчыцы сталовай працуе ўжо год, кажа, што работа вельмі падабаецца. Раней працавала ў горадзе, на рабоце трэба было быць ужо а 6-й гадзіне раніцы. Тут прасцей, бо нікуды ехаць не трэба. Ды і калектыў падабаецца. Сваёй прафесіяй таксама задаволена. У наступным годзе атрымае дыплом аб вышэйшай адукацыі Магілёўскага універсітэта харчавання. Мяняць у сувязі з гэтым вёску на горад не збіраецца, бо тут кватэра, сям'я. Ды і бацькі побач.

Дарэчы, «Дзяўчаты» — любімы фільм Яўгеніі. Кажа, што калі добра падумае, то можа, як Тоня Кісліцына, усе 50 відаў бульбяных страў назваць. Але для надзейнасці дастае вялікую кнігу з рэцэптамі. Там іх столькі, што жыцця не хопіць усё пакаштаваць. Але тутэйшы народ без вялікіх запытаў, больш любіць праверыныя часам гуляшы, катлеты і ўсё астатняе, дзе ёсць сапраўднае мяса. Добра выручаюць паўфабрыкаты, якія гаспадарка вырабляе на сваім мясакамбінаце, каўбаскі «Беларускія», купаты «Арыгінальныя» і гэтак далей. Гароднінай забяспечваюць агракамбінаты «Вейна» і «Кадзіна». Здзіўляць народ асабліва няма чым, але тут імкнуцца. На працягу тыдня стараюцца, каб стравы не паўтараліся. На першае часцей за ўсё бываюць боршч, расольнік, суп гарохавы, з макаронамі, з рысам, пярлоўкай, просам. На другое, акрамя згаданага мяса, гарнір — капуста або бульба тушаная, пюрэ, рагу, але часцей лідзіруюць карысныя для здароўя вязкія кашы — грэчневая, рысавая, прасяная, ячная.

Мне, як навічку, было цяжка ўявіць, як гэта — гатаваць вялікімі порцыямі. «Нічога складанага, — пацiснулі плячыма прафесіяналы. — Для супу на 70 порцый (менавіта на столькі чалавек у сярэднім тут рыхтуецца ежа) трэба кожны дзень начысціць 12 кіло бульбы — паўтара вядра. Для двух вопытных чалавек працы на паўгадзіны. Больш трэба намагання, каб зрабіць пюрэ або катлеты. Гэта больш працяглыя па часе заняткі, ды і больш складаныя. На тыя ж катлеты трэба мяса перакруціць, звæжыць, сфармаваць і спячы.

## Хто як есць, той так і працуе

Знаёмлюся з часовымі калегамі па рабоце — поварам Жанай Рудзічавай і кухоннымі работнікамі Алай Ярашэвіч і Таццянай Ніканавай. На кухні працуе яшчэ 2 чалавекі, але ў іх выхадны дзень. Калектыў дружны і вясёлы.

Рабочы дзень пачынаецца з 7, і да 10 ужо ўсё зварана. У 50-літровай каструлі стыне свежая капуста, яшчэ ў адной глыбокай ёмкасці даходзіць да кандыцыі каша. З 11 пачынаецца выезд на аб'екты. На двары нас чакае белы мікраўтобус. Кіроўца дапамагае перанесці цяжкія бітоны ў машыну, і мы бяром курс на Бракава. Суправаджае нас намеснік генеральнага дырэктара па раслінаводстве Яўген Сялюгін. Ехаць паміж дагледжаных палёў адно задавальненне. «Ураджайнасць ячменю і зернебабовых у нас 65-70 ц/га, — каментуе Яўген. — Пшаніцы наогул 70-80 ц/га. Гэта ўсё дзякуючы своечасовай падкормцы мінеральнымі ўгнаеннямі, высокай абароне раслін, якаснаму пасяўному матэрыялу, правільнай падрыхтоўцы глебы. Тут праца ўсіх спецыялістаў гаспадаркі».

Збожжа ідзе на збожжаток гаспадаркі, потым на камбікорм птушцы і жывёле. Умоўна кажучы, ураджай-2016 даходзіць да спажыўцоў у выглядзе смачных каўбас і паўфабрыкатаў з маркай «Зара».

«Прыехалі», — аб'яўляе Яўген, і мы пачынаем падрыхтоўку да прыёму камбайнераў. Нарэшце на гарызонце паяўляецца «Лексіён», славуты экіпаж двух Уладзіміраў, бацькі і сына Корсакаў, пастаянных лідараў жніва. Побач кіруе грузавіком таксама неадназовы пераможца па перавозках зерня на збожжаток Хасія Лангуры. Яго машына праязджае міма. «Ён снедае ў сталовай. Гэта як раз па суседстве са збожжатокам», — тлумачыць Яўгенія Маісеенка, перахапіўшы мой здзіўлены позірк. Да нашай перасовачнай сталовай накіроўваецца пакуль што адзін Уладзімір Корсак.

— Прагаладаліся? — ветліва сустракаю героя.

— Вядома, — адказвае ён. Інтрыгі не атрымалася. Журналістаў за гады свайго лідарства на полі жніва ён навучыўся пазнаваць у твар. Не дапамагло нават спецадзенне. Але выкрываць мяне не стаў, наадварот, уключыўся ў гульню. «Цікава, а што гэта ў нас за свята. Галоўны аграном і загадчыца сталовай прыехалі?»— зрабіў ён здзіўлены выгляд.

Пакуль машына не вернецца са збожжатока, у камбайнера ёсць некалькі хвілін падсілкавацца і адпачыць. Чалавек з шасці раніцы на працы, стаміўся. А наперадзе яшчэ цэлы дзень работы на полі.

— Працуем дацямна, сіл хапае толькі дайсці да дома і заваліцца спаць, — прызнаецца Уладзімір Корсак.

Дапамагаюць яму сёлета на чарзе два сыны — Уладзімір, за плячамі якога ўжо армія, і Вадзім, якому 17 гадоў.

На пах ежы падцягнуліся і ратавальнікі. Яны падчас жніва працуюць з хлебаробамі ў адной звязцы. Калі на вуліцы плюс 30, камбайн награецца так, што да бяды можа давесці любая іскра.

— Без іх у спякоту нельга, — адзначае важнасць прысутнасці ратавальнікаў пры ўборцы Уладзімір. — Сочаць за тым, каб нідзе не было задымлення.

З-за павароту паказваецца грузавік Хасіі, і Уладзімір бяжыць хутчэй за штурвал. На змену яму прыязджаюць Уладзімір і Дзмітрый Мельнікавы. Гэты сямейны экіпаж, вобразна кажучы, наступае на пяткі Корсакам. На 9 жніўня спіс рэкардсменаў з 2 543 тонамі намалочанага збожжа ўзначальваў Уладзімір Корсак, следам з лічбай 2 452 ішоў Уладзімір Мельнікаў. Абодва экіпажы працуюць на адным полі, і паміж імі здаровы спартыўны азарт. Хутка перакусілі і хутчэй да свайго «Лексіёна». А мы едзем далей. Да 2 гадзін трэба ўсіх накарміць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


І накормяць, і падбадзёраць.

■ Будзь у курсе!

## ПРАЕЗД ЧЫГУНКАЙ ПА РАСІІ ПАДАРАЖЭЭ

**З 15 жніўня Расійская чыгунка павялічвае міжнародныя тарыфы на праезд пасажыраў.**

Гаворка ідзе пра зносіны з нашай краінай. У гэтай сувязі прэс-цэнтр Беларускай чыгункі распаўсюдзіў інфармацыю, што з пазначанай даты кошт праезду па тэрыторыі Расійскай Федэрацыі павялічыцца ў сярэднім на 3-8 працэнтаў. Канкрэтны памер павелічэння міжнародных тарыфаў залежыць ад адлегласці і катэгорыі вагонаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 426162

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым №225855100001000500 площадью 0,0670 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, г.п. Шумилино, ул. Луначарского, 8 для строительства и обслуживания здания, предназначенного для выполнения работ, оказания услуг (11620 для размещения объектов неустановленного назначения). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена (с учетом/до деноминации)**: 4235,78/42 357 800 бел. руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 423,58/4 235 800 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **16.09.2016 в 15.00** по адресу: Витебская обл., г.п. Шумилино, ул. Короткина, 10, каб. 226 в Шумилинском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: **с 15.08.2016 с 8.30 по 15.09.2016 до 17.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Реквизиты для внесения задатка: р/с 3604023815183 ЦБУ 225 г.п. Шумилино ф-л №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300037038, код платежа 04002, получатель платежа: Шумилинский райисполком |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в течение 2 рабочих дней после внесения денежных выплат заключить с Шумилинским райисполкомом договор аренды зем. участка; в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды но не позднее 3 месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, обратиться за гос. регистрацией возникновения права на зем. участок; получить архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Шумилинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года; обеспечить начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения проектной документации, осуществить строительство в сроки, определенные проектной документацией; после получения разрешения на строительство объекта снять плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его на благоустройство участка. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр.лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

| |
|---|
| **Продавец:** Браславское районное потребительское общество, 211970, Республика Беларусь, г. Браслав, ул. Садовая, 2, факс/тел. (02153) 61-002 |
| Лот №1. Капитальное строение с инв. №210/С-11405, площадью 132,8 кв.м, наименование – магазин «Веснянка» по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Горная, д. 2а на зем.участке с кадастровым №220850100001000729 площадью 0,0628 га. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации)**: 59 737,01/597 370 100 бел. руб. с НДС. Задаток** (с учетом/до деноминации)**: 5 973,70/59 737 000 бел. руб.** |
| Повторный аукцион состоится **14.09.2016 в 10.00** по адресу: г. Браслав, ул. Садовая, 2 в Браславском районном потребительском обществе. Срок внесения задатка и подачи документов: **с 15.08.2016 с 8.30 по 13.09.2016 до 17.30**. Условия аукциона: заключить договор купли-продажи не позднее 7 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» от 17.06.2016. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 20.09.2011 №301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ, подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона отказаться от проведения аукциона. **Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**



Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №1624497 **считать недействительным.** УНП 100122726

КАНТАКТ
№ 4 (38)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белсаюздрук»



■ Сэрвіс

# ЧЫМ ПРЫВАБЛІВАЕ «БЕЛСАЮЗДРУК»

**У замежных фільмах і серыялах часта можна ўбачыць эпізод, дзе галоўны герой, зручна ўладкаваўшыся на лаўцы ў маляўнічым парку, з асалодай пацягвае каву і засяроджана чытае свежую газету. Выдумка галівудскіх рэжысёраў? Не, будні сучаснага мінчаніна! Мы даведаліся пра наваўвядзенні і планы прадпрыемства «Белсаюздрук», якое гатова забяспечыць сваім кліентам «і хлеб, і відовішчы».**



РУП «Белсаюздрук» з'яўляецца асноўным распаўсюджвальнікам перыядычных выданняў у сталіцы. На 1 ліпеня гэтага года ў Мінску было зарэгістравана 349 гандлёвых аб'ектаў. З іх: 27 магазінаў, 37 павільёнаў і каля 300 кіёскаў. Павільёны ставяць у месцах з найбольш высокім узроўнем пакупніцкага патоку. Часцей за ўсё імі замяняюць кіёскі, фармат якіх не дае магчымасці задавальняць усе запыты спажыўцоў. Аднак бываюць выпадкі, калі павільёны з'яўляюцца ў абсалютна новых месцах, звычайна такая сітуацыя характэрна для мікраараёнаў, якія актыўна забудоўваюцца.

«Значна прасцей паставіць павільён у «правераным кіёскам» месцы. Аднак мы праводзім сур'ёзныя даследаванні, каб высветліць, дзе і якога тыпу гандлёвыя аб'екты неабходныя. Гэта дазваляе спрагназаваць сітуацыю, але не дае стопрацэнтнай гарантыі поспеху. І ўсё ж мы гатовы браць на сябе адказнасць і рызыкаваць дзеля павышэння якасці абслугоўвання», — дзеліцца сакрэтамі працы начальнік аддзела арганізацыі гандлю «Белсаюздруку» Вольга БАРКО.




У пачатку наступнага тыдня будзе адчынены ўжо 38-ы па ліку сучасна абсталяваны павільён. 24-метровая гандлёвая пляцоўка размясцілася па вуліцы Прытыцкага, 56. Зараз вядуцца работы па ўстаноўцы яшчэ аднаго павільёна: ён адчыніць свае дзверы для пакупнікоў у пачатку верасня на вуліцы Калеснікава ў новым мікраараёне Каменная Горка. Адкрыццё будзе прымеркавана адразу да двух святаў: да Дня горада і Дня беларускага пісьменства.

Павільёны бываюць трох памераў: 24, 40 і 60 «квадратаў». Найбольш буйныя дзеляцца на дзве часткі: магазін з друкаванай прадукцыяй і паўнавартасны кафетэрый. У тых, што паменш, выбар пачастункаў не такі багаты, аднак без кубачка кавы вас не пакінуць: амаль у кожным павільёне ёсць кавамашына. Тых, хто не можа спакойна паснедаць, не расказаўшы пра гэта ў сацыяльных сетках, чакае прыемны бонус — доступ да бясплатнага вай-фаю. Кнігі ў павільёнах можна не толькі купіць, але і проста ўзяць: прадпрыемства падтрымлівае развіццё буккросінгу. Калі ж вам трэба набыць білеты на канцэрт, аплаціць камунальныя паслугі, забраць заказ з інтэрнэт-крамы «Белсаюздруку» ці зрабіць адразу ўсё са спісу, гандлёвыя павільёны зноў прыйдуць на дапамогу.

«Пакуль для сталічнага спажыўца гэта ў навіну, хаця да добрага хутка прывыкаеш. Напрыклад, кава ад «Белсаюздруку» ўжо стала своеасаблівым брэндам. Гэта пры тым, што актыўна ставіць павільёны, у якіх ёсць магчымасць аказваць у тым ліку і такія паслугі, мы пачалі ўсяго некалькі гадоў таму, — расказвае Вольга Барко. — Імкненне да шматпрофільнасці адпавядае патрабаванням сучаснага ладу жыцця. Чалавек зайшоў за газетай і ў гэтым жа месцы яму ўдалося вырашыць яшчэ шмат пытанняў, дзякуючы чаму ў яго вызваліўся час. Для мінчан, якія жывуць у пастаяннай спешцы, гэта велізарны плюс».

У гандлёвых павільёнах таксама можна набыць латарэі, праязныя квіткі, кнігі, цацкі, сувенірную прадукцыю. Ужо завяршылася падрыхтоўка да школьнага сезона: на прылаўках акуратна раскладзеныя рознакаляровыя канцылярскія прылады роўнымі стосамі ляжаць свежанадрукаваныя дапаможнікі, рабочыя сшыткі, контурныя карты і іншая вучэбная літаратура. Калі дзяцей парадуе вялікі выбар прыгожых сшыткаў і нататнікаў, то бацькі ацэняць выгадную прапанову: пры пакупцы тавараў для школы на суму ад 20 рублёў кожны атрымлівае купон на 10-працэнтную зніжку. У планах — распаўсюджваць купоны і больш незвычайнымі спосабамі. Напрыклад, іх можна будзе выпадкова знайсці сярод старонак перыядычнага выдання ці кнігі.

Заўсёднікі павільёнаў ведаюць, што часта можна напасці на прыемную акцыю: купля газеты разам з кавай прыносіць пэўныя бонусы. Нядаўна была ўведзена паслуга растэрміноўкі на два месяцы. Гэта дае магчымасць разабрацца з аплатай без істотных цяжкасцяў. Прадстаўнікі прадпрыемства імкнуцца дэталёва прадумаць умовы, якія забяспечаць камфорт усім катэгорыям пакупнікоў: у буйных павільёнах абсталяваны велапаркоўкі, для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і мам з калясkамі ўстаноўлены пандусы. Паступова «Белсаюздрук» пашырае свае сацыяльныя функцыі, ператвараючы гандлёвыя аб'екты ў месцы для зносін.

**Тых, хто не можа спакойна паснедаць, не расказаўшы пра гэта ў сацыяльных сетках, чакае прыемны бонус — доступ да бясплатнага вай-фаю.**

«Мы падтрымліваем цесную сувязь з нашымі пакупнікамі, заўсёды гатовы прыняць да ведама іх заўвагі і прапановы. Скажу шчыра, што прыслухоўваючыся да пажаданняў, мы атрымліваем мноства станоўчых водгукаў, у тым ліку і ў выглядзе пісьмовых падзяк, — з гонарам адзначае Вольга Барко. — Гэта асабліва важна таму, што наша задача не проста прадаць тавар, а аказаць якасную паслугу, нават у нейкай ступені зрабіць яе атрыманне прыемным».

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*




■ З нагоды

# «СІМВАЛ БАГАЦЦЯ І РОСКВІТУ»

## Для новай крамы ў Гродне заказалі прадукцыю з беларускай сімволікай

**16 жніўня на вуліцы Савецкай, у гістарычным цэнтры горада над Нёманам прадпрыемства «Гроднааблсаюздрук» урачыста адчыніць для пакупнікоў дзверы сваёй першай крамы.**



— Мы назвалі яе «Багач», — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **дырэктар прадпрыемства «Гроднааблсаюздрук» Павел СКРАБКО.** — У беларускай сімволіцы гэта сімвал багацця і росквіту. У пэўным сэнсе гэта будзе тычыцца і людзей, якія завітаюць у нашу краму і купяць там якасныя тавары па выгадных цэнах.

**— Які асартымент прапануеце пакупнікам?**

— Спецыфіка нашага гандлю — тыпу «тысячы дробязяў». Перш за ўсё, канешне, гэта газеты, часопісы, кнігі, а таксама канцылярскія тавары, галантарэя, парфумерыя, сувенірная прадукцыя і г. д. — шмат усякай усячыны. Пачалі развіваць продаж дробных прадуктаў харчавання ў фасаваным выглядзе, каб чалавек, зайшоўшы, напрыклад, за газетамі, мог набыць і іх. Пры гэтым стараемся, каб нашы цэны былі канкурэнтнымі ў параўнанні з іншымі гандлёвымі прадпрыемствамі. Таму не толькі прыдумалі слоган «Тэрыторыя выгадных цэн», але і ажыццяўляем такую цэнавую палітыку на практыцы. Перш чым устанавіць цану на той ці іншы тавар, аналізуем яго кошт у іншых гандлёвых сетках і імкнёмся зрабіць так, каб у нас было танней. Думаю, што многія пакупнікі гэта адчуваюць.

Што тычыцца нашай першай і, мяркую, не апошняй крамы, то асартымент тавараў у «Багачы» будзе самы шырокі сярод гандлёвых кропак «Гроднааблсаюздруку». Спадзяюся, што гродзенцаў і гасцей горада парадуюць і цэны, а таксама наша імкненне працаваць, так бы мовіць, з нацыянальным каларытам. Усе цэннікі, элементы афармлення крамы будуць на беларускай мове. Больш за тое, заказалі вытворцам сувенірную прадукцыю менавіта з беларускай сімволікай — зямлі, сям'і, дзяцей, шчасця...

Хачу адзначыць, што тавары мы стараемся браць, як правіла, у беларускіх вытворцаў. Вызначылі асартымент прадукцыі дастойнай якасці, якая нічым не горшая за імпартную, і яе з задавальненнем купляюць.

**— Як «Гроднааблсаюздрук» развіваецца ў рэгіёнах?**

— Зараз у нас 192 кіёскі, у тым ліку 25 павільёнаў. Будзем павялічваць іх колькасць, мадэрнізаваць існуючую гандлёвую сетку. Напрыклад, нядаўна адчынілі вялікі кіёск у Ашмянах, яшчэ адзін неўзабаве з'явіцца ў Астраўцы. Больш сучасным стане і кіёск у Воранаве, дзе сёлета адбудуцца абласныя «Дажынкі».

**— Мяркуючы па сайце прадпрыемства, інфармацыя пра новыя тавары і паслугі аператыўна даводзіцца да патэнцыяльных кліентаў ...**

— Так, імкнёмся, каб сайт быў цікавым для нашых наведвальнікаў. Напрыклад, каб яны ведалі, што мы першымі ў вобласці выrабляем 3D-фота, візіткі, календары, калажы. Прапануем рэйтынг самых папулярных кніг, нейкія цікавінкі для падрастаючага пакалення. Нядаўна запрасілі крэатыўна мыслячую моладзь паўдзельнічаць у конкурсе графічных выяў «GIFаманія». Лепшыя работы ў намінацыях «Сям'я», «Мая Гродзеншчына», «Свет жывёл», «Арт-Гіф» адзначым прызамі.

Акрамя таго, расказваем на сайце пра маладзёжныя ініцыятывы, якія мы падтрымліваем, — праекты «Жывая гісторыя», «Каложскі крыж» (па стварэнні сімвала Гродзенскай вобласці), «Гарадзеншчына. Варта ўбачыць». Мяркую, што нашаму прадпрыемству, якое прысутнічае ва ўсёй вобласці, многіх населеных пунктах, сам Бог загадаў падключыцца да такіх праектаў, якія скіраваныя на папулярызацыю рэгіёна, яго турыстычную прывабнасць.

Займаемся і дабрачыннай дзейнасцю, наведваем дзяцей у сацыяльных прытулках і дамах сямейнага тыпу з падабранымі па ўзросце кнігамі, часопісамі, размалёўкамі... Сёлета такія акцыі правялі ў Гродне, Шчучынскім раёне, а наступная неўзабаве адбудзецца на Лідчыне.

**З архіўных матэрыялаў**

2. заключить с сельисполкомом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня его подписания, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

**Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 936-275, 937-290.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 28 (328)

■ За падзеяй

# Хто стане чалавекам Года культуры?

## Пакажуць вынікі адпаведнага конкурсу, аб'яўленага Міністэрствам культуры

**Да 10 лютага 2017 года будзе праходзіць конкурс «Чалавек Года культуры». Пра гэта паведаміла першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА. Ён праводзіцца ў 14 намінацыях, прыняць удзел у гэтым творчым спаборніцтве могуць грамадзяне Беларусі — работнікі сферы культуры, педагогі ўстаноў адукацыі ў галіне культуры, супрацоўнікі СМІ, сябры творчых саюзаў.**

Так, крытэрыямі ацэнкі канкурсантаў у намінацыях «Выяўленчае мастацтва», «Тэатральнае мастацтва», «Музычнае мастацтва», «Харэаграфічнае мастацтва», «Эстраднае мастацтва», «Цыркавое мастацтва», «Кінавідэамастацтва» стануць мастацкі ўзровень творчай дзейнасці ўдзельніка на працягу перыяду правядзення конкурсу; публічны паказ твораў цягам года, атрыманы пры гэтым сацыяльны і эканамічны эфект; грамадскі рэзананс вынікаў дзейнасці, у тым ліку поспехі на міжнародных спаборніцтвах, водгукі ў прэсе.

Удзельнікаў конкурсу ў намінацыях «Музейная дзейнасць», «Бібліятэчная дзейнасць», «Клубная дзейнасць» будуць ацэньваць паводле іх прафесійнага майстэрства, дасягненняў, наватарства, будзе звернутая ўвага на правядзенне ў 2016 годзе новых значных акцый, удзел у міжнародных і рэспубліканскіх форумах. Крытэрыямі ацэнкі ў намінацыях «Народная творчасць», «Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» стануць мастацкі ўзровень і грамадскі рэзананс вынікаў працы ўдзельніка, арыгінальнасць інтэрпрэтацыі нацыянальных мастацкіх традыцый; значнасць праектаў у галіне адраджэння, захавання традыцый і развіццё сучасных кірункаў мастацкай творчасці, удзел на працягу года ў міжнародных, рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях.

Прымяненне эфектыўных форм работы па падтрымцы таленавітай моладзі, выніковасць працы па падрыхтоўцы пераможцаў міжнародных конкурсаў, алімпіяд стануць вызначальнымі момантамі ў выяўленні пераможцы ў намінацыі «Педагагічная праца з творчай моладдзю». А вось у намінацыі «Асвятленне пытанняў культуры ў СМІ» будуць брацца пад увагу грамадскае прызнанне, актуальнасць і папулярнасць аўтарскіх матэрыялаў па пытаннях культурнага жыцця краіны; паўната і рознабаковасць асвятлення культурных падзей; майстэрства падачы матэрыялу.

Мяркуецца, што прапаноўваць кандыдатуры можна будзе з 2 па 15 студзеня 2017 года, а вынікі працы журы будуць падведзеныя з 1 па 10 лютага. Пераможцы будуць названыя на ўрачыстай цырымоніі, яны атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі ў памеры 25 базавых велічынь.

З падрабязнай інструкцыяй аб правядзенні конкурсу можна пазнаёміцца на сайце Міністэрства культуры. Яго арганізатарамі таксама выступілі Міністэрства інфармацыі, абласныя выканаўчыя камітэты, Мінскі гарвыканкам, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Невядомае пра вядомых

# АДКРЫВАЛЬНІК ЗАБЫТЫХ ІМЁНАЎ

## Навуковец, які вярнуў беларусам цэлае пакаленне мастакоў



**«Лёнька, шасцігадовы вясковы хлапчук, сын настаўніка Бубнаўскай школы, ляжыць на высокім беразе тварам уверх і пільна ўглядаецца ў плывучыя аблокі. Якія яны цікавыя. І ўвесь час розныя,» — так у мемуарах «Шляхамі жыцця. Успаміны былога партызана», у главе, якая называецца «Лёнька», піша пра сябе доктар мастацтвазнаўства, прафесар, вядомы мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Леанід Дробаў. Рукапіс датаваны 2002 годам, тым самым, калі Леаніда Міканоравіча не стала...**

Так, усім вядома, што Леанід Дробаў стаў адкрывальнікам цэлай плеяды імёнаў беларускіх мастакоў XIX стагоддзя, што па яго кнізе «Жывапіс Беларусі XIX — пачатку XX стагоддзя» і дагэтуль вывучаюць айчыннае мастацтва, што ён выхаваў шмат аспірантаў, амаль 40 гадоў узначальваў аддзел у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. Але сёлета, калі мы адзначаем 90 гадоў з дня нараджэння Леаніда Дробава, варта яшчэ раз прайсціся сцяжынамі памяці пра гэтага таленавітага чалавека з надзвычайнай жыццёвай энергіяй, зазірнуць у яе невядомыя завулкі і прыгадаць нечаканыя факты пра знакамітага мастацтвазнаўца.

### Умеў шыць і смачна гатаваў

Удава Леаніда Дробава Святлана Фёдараўна задумена перагортвае старонкі сямейнага альбома. Кажа, калі Міканоравіча (менавіта так, з павагай яна называе мужа) не стала, першы час вельмі сумавала, пераглядала фотаздымкі, уклейвала іх у альбом. Яна распавядае:

— Бацька і маці Леаніда Дробава былі настаўнікамі. Маці паходзіла з сям'і святара, і ад дзядулі Марка, які быў бацюшкам і пісаў іконы, імкненне да мастацтва перадалося хлопчыку Лёню. У сям'і было шасцёра дзяцей, Леанід — самы старэйшы. Пэўны час маці з бацькам заставаліся без працы, іх звольнілі са школы з-за таго, што дзядуля Марк, святар, каб дапамагчы, намаляваў школьную насценгазету. І ад голаду ў той складаны час, калі настаўнікам было забаронена мець уласную гаспадарку, сям'ю ратавалі менавіта Леанід з сястрой Нінай. Яны недзе адшукалі старую швейную машыну, нейк не падрамантавалі, каб можна было шыць. Лёня распароў старыя буркі і па іх узоры пачаў рабіць выкрайкі новых. Спачатку шылі абутак толькі для сябе: Ніна круціла ручку машыны, а Лёня шыў. Аднавяскоўцы хутка даведаліся пра тое, што можна пашыць сабе буркі, і пачалі рабіць заказы. Атрымалася так, што дзеці сваім заняткам зараблялі прадукты для сям'і, бо сяляне разлічваліся за работу ў асноўным яйкамі, малаком — тым, што самі мелі.

Потым уменне шыць вельмі спатрэбілася Леаніду Міканоравічу ў жыцці. У час вайны, калі ён быў у партызанах, дапамагаў рамантаваць адзенне і нават шыў пілоткі.

— Тата быў вельмі рацыянальным, гаспадарлівым чалавекам, — дзеліцца ўспамінамі старэйшы сын Леаніда Дробава Канстанцін. — Пэўны час мы жылі вельмі бедна, і тата, пішучы кандыдацкую дысертацыю, падзарабляў шыццём. Таксама ён выдатна гатаваў, умеў, як кажуць, кашу з сякеры зварыць. Квасіў капусту, варыў халадзец, смачныя супы з вельмі простых прадуктаў. А калі памерлі яго бацькі, на іх магіле паставіў грандыёзны помнік, які не запатрабаваў вялікіх грашовых выдаткаў. Дарэчы, для яго сам вылепіў барэльеф.

Кулінарныя здольнасці Леаніда Дробава цанілі і сябры. Збіраліся ў яго майстэрні, дзе ён час ад часу на плітцы смажыў бульбу па фірмовым рэцэпце. Кажуць, хрумсткая скарыначка ў яго атрымлівалася неверагодна смачнай.

### Сябраваў з Караткевічам і Барадуліным

Нягледзячы на тое, што Леанід Дробаў быў мастаком і мастацтвазнаўцам, у пісьменніцкім асяродку яго таксама вельмі паважалі. Нават меў дачу у пісьменніцкім кааператыве, на знакамітай Лысай Гары.

У архіве Святланы Дробавай і сёння захоўваецца кніга паэзіі «Неруш» Рыгора Барадуліна з арыгінальным аўтографам-прысвячэннем:

*Дарагому Лявону,*
*які робіць шмат,*
*які зробіць шмат,*
*і будзе зваца лаўрэат*!*
**) любой прэміі.*
5.VI.1969 г. Рыгор.

Сябраваў Дробаў і з Уладзімірам Караткевічам, у літаратурнай апрацоўцы пісьменніка ў 1971 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшла кніга Леаніда Міканоравіча «Беларускія мастакі XIX стагоддзя». Дарэчы, гэтая супраца мела станоўчы ўплыў на творчасць абодвух майстроў. Проза Караткевіча ўзбагацілася новымі постацямі, героямі, а стыль пісьма Дробава стаў больш вобразным.

### Марыў стаць капітанам далёкага плавання

У бліц-інтэрв'ю, змешчаным у кнізе «Шчыра, як на духу... Споведзі вядомых людзей Беларусі», Леанід Дробаў прызнаецца, што ў дзяцінстве хацеў быць капітанам, адкрывальнікам новых зямель.

— Такое жаданне патлумачыць вельмі проста, — кажа Святлана Дробава, — яго далёкі сваяк па маці служыў на караблі. Калі прыязджаў у вёску, што на Гомельшчыне, у прыгожай форме, расказваў незвычайныя гісторыі, каб паглядзець на яго і паслухаць расповеды збіралася амаль уся вёска. Гэтыя рэдкія спатканні не маглі не ўразіць хлопчыка.

А вось яго бацька марыў пра тое, каб сын напісаў кнігі, па якіх будуць вучыцца іншыя. І бацькоўскі запавет Леанід Міканоравіч цалкам выканаў. Пасля вайны яму прапанавалі застацца ў арміі, але малады чалавек вельмі хацеў вучыцца, меў вялікую прагу да ведаў. Пасля вызвалення Беларусі адвучыўся ў вячэрняй школе, паступіў у мастацкае вучылішча, якое скончыў у 1956 годзе, у гэты ж час быў студэнтам факультэта журналістыкі БДУ, дыплом аб сканчэнні якога атрымаў у 1958-м, праз год паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут, а праз тры — скончыў аспірантуру БДУ. У 1963-м абараніў кандыдацкую дысертацыю, доктарам навук стаў у 1984 годзе, а званне прафесара атрымаў у 1987-м.

**«Проза Караткевіча ўзбагацілася новымі постацямі, героямі, а стыль пісьма Дробава стаў больш вобразным».**

Але і сваю дзіцячую мару Леанід Дробаў часткова спраўдзіў. Ён стаў адкрывальнікам — хай не новых земляў, але невядомых ці забытых імёнаў беларускіх мастакоў. Шмат працаваў у архівах, бібліятэках, музеях Польшчы, а сваімі ўражаннямі ад вандроўкі ў Варшаву, Кракаў, Вроцлаў, Познань падзяліўся ў серыі артыкулаў «У пошуках скарбаў», што выйшлі ў 1970 годзе на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» пад рубрыкай «Нататкі мастацтвазнаўцы».

### Лічыў карціны сваімі дзецьмі

— Тата мяне амаль ніяк не выхоўваў, толькі скіроўваў, — кажа старэйшы сын Леаніда Міканоравіча Канстанцін. — Бачыў, што я прыйшоў дадому з сіняком пад вокам, што з некім зладзіў бойку, і жартам казаў: «Ну ўсё, другога разу не будзе». Ніякага маралізатарства. Ён хацеў, каб я стаў мастаком. І першапачаткова я некаторы час працаваў у яго ў майстэрні. Але мне фатаграфаваць падабалася больш, чым маляваць, таму я ўсё жыццё прысвяціў фотамастацтву.

З малодшым сынам Яўгенам (які нарадзіўся ў новым шлюбе з маладой жонкай, калі Дробаў ужо быў вядомым чалавекам, у досыць сталым узросце) у Леаніда Міканоравіча былі крыху падобныя стасункі:

— Знешне не праяўляў пачуццяў, але ўнутры вельмі перажываў, хваляваўся за сына, калі ён затрымліваўся з заняткаў, — дзеліцца Святлана Фёдараўна. — Калі сын падрастаў, бацька хацеў, каб ён стаў мастаком, але Яўген не праявіў цікавасці да малявання. Затое ўнучка ўжо ў 7 гадоў досыць добра малюе.

Часцей за ўсё ўся сям'я Дробавых разам збіралася ў суботу і ў нядзелю за сняданкам, бо ў штодзённых клопатах, калі кожны быў заняты ўласнымі справамі, маглі і не мець магчымасці доўга бачыцца.

— За сняданкам Міканоравіч мог задаваць многа пытанняў сыну, успамінаў вершы і прасіў яго адгадаць, хто аўтар. А потым — разыходзіліся ў розныя бакі, па сваіх справах, — успамінае Святлана Дробава. — Ды і ў выхадныя дні муж мог узяць з сабой крыху ежы і пайсці на ўвесь дзень, да самага вечара ў майстэрню. Калі вяртаўся, часам прыносіў ежу некранутай: нават не меў магчымасці адарвацца ад справы.

Удава Леаніда Дробава прыгадвае, што ён заўсёды казаў: «Карціны — гэта дзеці», бо ў іх укладзена столькі шчырых пачуццяў, думак мастака. Таму вельмі шкадаваў, рэдка аддаваў, дарыў свае работы. Гэта была неўзнаўляльная страта.

— А потым неяк падумаў, пабачыў, што плён працы многіх мастакоў не знаходзіць інтарэсу наступнікаў і знікае, і вырашыў стварыць галерэю на радзіме, — дадае спадарыня Святлана.

Леанід Дробаў быў адным з першых мастакоў, які падарыў роднаму мястэчку 120 сваіх работ для экспазіцыі. Галерэя ў Акцябрскім, што на Гомельшчыне, адкрылася ўвосень 1990 года. А калі мастак пайшоў з жыцця, установа стала насіць яго імя. Дарэчы, паводле яго запавету, пахаваны Леанід Міканоравіч там жа, у Акцябрскім, непадалёк ад магіл бацькоў.

— Да апошніх дзён Міканоравіч меў жаданне будаваць, нешта рабіць, — кажа Святлана Дробава. — Нават у 70 гадоў узяўся будаваць сабе дачу. Быў вельмі энергічны. Калі прачынаўся зранку, меў дакладны план спраў на дзень. І ўжо гадзін у 8 раніцы пачынаў яго рэалізоўваць, тэлефанаваць па справах. Казаў, калі нейкі дзень прапусціў, нешта не зрабіў, то час прайшоў бессэнсоўна.

Кажуць, чалавек жыве, пакуль жыве памяць пра яго. І, думаецца, зорка выдатнага мастака і навукоўца Леаніда Дробава яшчэ доўга будзе асвятляць шлях паплечнікаў і наступнікаў. Яго кнігі запатрабаваныя студэнтамі і навукоўцамі, яго мастацкія палотны здзіўляюць тэхнікай і вобразнасцю, да яго архіўнай спадчыны можна дакрануцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, а таксама ў галерэі імя Дробава і краязнаўчым музеі ў Акцябрскім. Ды і ў цэлым, яго справа, многія выпускнікі мастацтвазнаўчай школы Леаніда Дробава — сёння паважаныя кандыдаты навук — працягваюць прыносіць плён айчыннай навуцы пра мастацтва. І хай так будзе надалей.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

Наш Кодэкс

# НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК

**Нядаўна быў прыняты першы ў гісторыі краіны Кодэкс аб культуры. Над стварэннем гэтага комплекснага і надзвычай важнага дакумента праца вялася на працягу некалькіх гадоў. Пра тое, якую ролю адыграе Кодэкс у культурным жыцці нашай краіны, разважае Зіновій ПРЫГОДЗІЧ, кандыдат філасофскіх навук, галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня», пісьменнік:**

— Хочацца найперш адзначыць, што Кодэкс аб культуры, які нядаўна прыняты ў нашай рэспубліцы, створаны не на пустым месцы. Ён увабраў у сябе сем законаў, чатыры Указы Прэзідэнта краіны і шмат іншых прававых дакументаў, якія дзейнічалі да гэтага ў сферы культуры. Можна нават сказаць, што Кодэкс ніякіх рэвалюцыйных змен не мае.

Дык у чым жа тады адметнасць і значэнне новага маштабнага дакумента?

Перш за ўсё менавіта ў гэтай маштабнасці. Дзясяткі розных нарматыўна-прававых актаў зведзены пад адну вокладку. І не проста механічна зведзены, а абагульнены, асэнсаваны і ў многім дапрацаваны. Удакладнена тэрміналогія, выключаны састарэлыя нормы, а таксама зняты пэўныя супярэчнасці, якія існавалі ў розных дакументах. Улічаны некаторы замежны вопыт у гэтай сферы. Хаця, як ужо адзначалі многія эксперты, наш Кодэкс — дакумент унікальны, які не мае аналагаў не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў свеце.

Гэта развагі агульнага плана. Разам з тым хацелася б сказаць, што канкрэтна парадавала ў новым дакуменце мяне асабіста як журналіста і пісьменніка, як чалавека, што пэўны час меў дачыненне да праблем культуры.

Па-першае, вельмі добра, што суб'ектамі культурнай дзейнасці названы спонсары і мецэнаты культуры. Думаю, што гэта не толькі павысіць грамадскі статус, але і значна актывізуе іх ролю ў вырашэнні існуючых праблем культуры. Што, безумоўна, надзвычай важна ў сённяшніх няпростых эканамічных умовах.

Па-другое, мне здаецца, вельмі своечасова і дастаткова грунтоўна сказана аб падтрымцы беларусаў замежжа. У апошнія гады ў мяне склаліся даволі цесныя адносіны з нашай дыяспарай, якая працуе ў Казахстане. Кіруе ёю вельмі актыўны і цікавы чалавек, таленавіты кампазітар Дзмітрый Астаньковіч. Нарадзіўся і вырас ён удалечыні ад радзімы. Аднак захаваў у сваёй душы глыбокую любоў і пашану да Беларусі. Самастойна вывучыў беларускую мову. Напісаў дзясяткі песень на вершы беларускіх паэтаў, якія выконвае не толькі на сходах суполкі, але і на канцэртах з самымі рознымі аўдыторыямі.


Фота Кастуся ДРОБАВА.

Дарэчы, канцэрты і шматлікія іншыя мерапрыемствы, якія ладзяць там нашы землякі, карыстаюцца нязменным поспехам. Казахі, рускія (а ў Казахстане жыве шмат розных нацыянальнасцяў) праяўляюць да беларускай культуры вялікую цікавасць. Гэтая цікавасць была б яшчэ больш значная, калі б сябры суполкі мелі ад нас крыху шырэйшую матэрыяльную падтрымку. У прыватнасці, яны вымушаны нават за свае сродкі набываць нацыянальныя беларускія касцюмы. Хочацца спадзявацца, што новы дакумент паспрыяе вырашэнню такіх праблем.

Па-трэцяе, мне не раз даводзілася сутыкацца з такой праблемай, як захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Многія палацавыя збудаванні, помнікі археалогіі (спрадвечныя валуны, старадаўнія дзядзінцы) разбураюцца, знішчаюцца толькі таму, што яны не ўзяты пад ахову дзяржавы. Раней зрабіць гэта было даволі няпроста. Цяпер, з прыняццем Кодэкса, гэтая працэдура стала значна прасцейшай. Акрамя таго, прадугледжаны сур'ёзныя меры для абмежавання разбуральнай дзейнасці так званых чорных капальнікаў.

І нарэшце чацвёртае і, можа, самае галоўнае — беларускай мове нададзена годнасць нематэрыяльнай каштоўнасці. Не сумняваюся, што гэта будзе садзейнічаць развіццю і папулярызацыі роднай мовы, а ў выніку — усёй беларускай культуры

Contemporary art

# ЛЕС ДОШАК

## Другі арт-праект прадстаўніка дынастыі Заслонавых

**У асобным пакоі Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў была прадстаўлена інсталяцыя маладога аўтара Піліпа Заслонава «Цёмны лес», што закранае надзённае экалагічнае пытанне: у меншай ступені ва ўтылітарным значэнні, у большай — у філасофскім кірунку сувязі паміж чалавекам і прыродай. Гэта значыць маралізатарскі матыў «не нашкодзь» счытваецца, але сукупнасць элементаў — аб'ектаў, відэа, музыкі і нават паху — накіроўвае думкі ў больш шырокае рэчышча.**

Неабгляблваныя дошкі стаяць у пакоі быццам дрэвы. На гэты «лес» праецыруецца відэа, у якім змантаваны эпізоды, што выяўляюць як прысутнасць, так і адсутнасць чалавека ў натуральным антуражы. Спецыяльна напісаная для інсталяцыі музыка вымушае паглыбіцца ў прапанаваную тэму, да таго ж у пакоі чароўна пахне дрэвам. Раю шукаць момант, калі вы зможаце застацца тут у адзіноце.

«У першую чаргу інсталяцыя павінна рабіць пэўнае эстэтычнае ўздзеянне, — кажа Піліп Заслонаў. — Што тычыцца ідэі, я паспрабаваў вярнуць дошкі, што некалі былі дрэвамі, якія накіравалі па іншым прызначэнні, на іх першапачатковае месца, каб сказаць — «мы знішчаем лес». У відэа можна ўбачыць уласна лес, закінутыя будынкі, будыйскіх манахаў, арла ў палёце, людзей у лодцы — я загадзя ведаў, што хачу паказаць, знайшоў відэа ў інтэрнэце і змантаваў. Музыку я напісаў сам з разлікам, каб наведвальнік поўнасцю паглыбіўся ў гэтую атмасферу, аказаўся ў стане нейкага трансу, каб з Мінска ён перамясціўся ў іншае месца, у сваё ўяўленне. Пах забяспечваецца выключна дошкамі, яны даволі сырыя, я нават не разлічваў на такі моцны водар, хоць і ведаў, што ён дакладна будзе.

Год таму Піліп Заслонаў прадставіў свой першы на мінскай пляцоўцы арт-праект: у тым жа Цэнтры сучасных мастацтваў быў адкрыты інтэрактыўны перфоманс «Ламаная лінія/The Broken Line». Прыкладна тады аўтар абмалёўваў дырэктарцы ЦСМ Наталлі Шаранговіч ідэю новага праекта.

«Сёлета я паказаў ёй малюнкі і стаў працаваць — шукаць дошкі і спосабы іх усталявання, вырашаць тэхнічныя пытанні. Інсталяцыю мы рабілі тры дні. Сама ідэя дошак, што стаяць вертыкальна на падлозе, узнікла ў мяне ўжо даўно, паступова ў вобраз праекта дадаліся відэаматэрыял, музычны фон, і гэта дарасло да інсталяцыі «Цёмны лес», — працягвае Піліп.


Фота Надзеі БУЖАН.

Усё ў «Цёмным лесе» накіроўвае думкі ў рэчышча сувязі чалавека з прыродай, дзе першы наўмысна адасабляецца ад свайго натуральнага кантэксту і, можна сказаць, узводзіць сябе на п'едэстал. У цёмным пакоі наведвальнік не толькі сузірае адбудаваны сучасны лес, але і прысутнічае ў ім, і рэагуе на яго таксама. Думкам лепш даць ісці сваім шляхам, а па вызначэнні пасля наведвання пакоя трэба яшчэ і ўсвядоміць, што камунікацыя з прыроднай часткай навакольнага свету, магчыма, патрабуе ад вас карэктыў. А экалогія — пытанне не толькі нашага фізічнага здароўя, але і стану, прабачце, душы. Як вобразамі дрэў сталі негабляваныя дошкі, так на месцы чалавека (ці вобразам яго стану) можа аказацца нешта скалечанае, непаўнавартаснае, што нацярпелася.

Піліп Заслонаў нарадзіўся ў Мінску, але пазней з сям'ёй пераехаў у Францыю, дзе жыве і сёння. Малады аўтар вывучаў архітэктуру інтэр'ера і дызайн аб'ектаў у школе Camondo ў Парыжы, а цяпер атрымлівае адукацыю па графічным дызайне ў школе Intuit Lab. Яго бацька Раман Заслонаў — вядомы мастак і ўнук Канстанціна Заслонава.

Інсталяцыю «Цёмны лес» можна ўбачыць у Цэнтры сучасных мастацтваў па вуліцы Някрасава да 3 верасня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

Кінакрокі

# Паміж тэлебачаннем і прыродай

## ПРАЙШОЎ ПАКАЗ НОВЫХ КАРОТКАМЕТРАЖАК МАЛАДЫХ АЎТАРАЎ

**Неадназначная роля тэлебачання і яго ўздзеянне на гледачоў — тэма для кінематографа ўжо амаль класічная. Тут вам і «Тэлесетка» Сідні Люмэта, і жудаснаваты «Відэадром» Дэвіда Кроненберга, і нарэшце «Шоу Трумана» Пітэра Уіра. Тэму працягнулі ў беларускай кароткаметражцы «Людаед» рэжысёра Аляксандра Высакоўскага, якую нам выпала аказія ўбачыць сярод іншых незалежных беларускіх карцін на паказе кароткага метра «Усе на «Верх». У прасторы SPACE на Кастрычніцкай былі паказаны тры работы — ужо вядомая нам па праекце «Кінаспрынт» «Эстафета» Міхаіла Пархоменкі, і новыя стужкі — «Людаед» і фільм «Пад шатамі дрэў» Ігната Качана. Зала, дарэчы, была запоўнена, наколькі гэта магчыма, — беларускае маладое кіно выклікае ўсё большую цікавасць. Недарэмна.**

Усе стужкі — дэбюты, кожная — кароткаметражная, аўтары — маладыя людзі. Паказы новых незалежных беларускіх фільмаў з такой дынамікай росту хутка стануць мэйнстрымам. Сёння яны не праходзяць незаўважанымі, больш за тое, не здаецца, маладое беларускае кіно робіцца моднай тэмай для абмеркавання. Магчыма, і модным заняткам.

Фільм «Людаед» кампаніі RedStudia, што спецыялізуецца на тэхнічным забеспячэнні вытворчасці аўдыявізуальнай прадукцыі, створаны як фестывальны — вытворцы выказалі надзею на адпаведную будучыню. Паказ «Людаеда» ў прасторы SPACE быў першым на вялікім экране і, напэўна, апошнім да моманту, пакуль работа не ажыццявіць рэйд па форумах.

Камерны фільм, адзінства часу, месца і дзеяння, выдатная акцёрская група. Тамара Міронава, Аляксандр Паўлаў, Ігар Сідорчык, Аляксандр Ткачонак, Валянціна Гарцуева, Святлана Някіпелава і іншыя. Дзеянне адбываецца ў парадным, а ў большасці ў каморцы кансьержкі (дэкарацыі былі пабудаваныя), якую сыграла Тамара Міронава. Злавесны пачатак, хоць на экране толькі і ўсяго, што антэна на даху шматпавярховіка, задае і тэму, і настрой, і трывогу. Праўда, гэты неспакой не абернецца для гледача стратамі ў нервовай сістэме — паўабсурдны, паўпасквільны, паўкамічны фільм будуе апасродкаваныя адносіны з рэальнасцю.

У сваёй каморцы гераіня Тамары Міронавай з гарачай гарбатай і якімі-някімі прысмакамі ўладкоўваецца перад тэлевізарам, нармальнай працы якога ўвесь час нешта перашкаджае: выява «снежыць», з дынаміка чуецца шум, тэлевядучы знікае з экрана.

Раздражнёны ўдар у бок прылады нарэшце рэанімуе карцінку, а ў эфіры тым часам невымоўна цікавае шоу, у якім разглядаецца беспрэцэдэнтны выпадак: у экспедыцыі малады чалавек з'еў таварыша, каб не памерці з голаду. І — якая нечаканасць! — людаед, што выйшаў у студыю даваць адказ на пытанні вядучага і жонкі памерлага таварыша, аказаўся Дзімам, які жыве ў гэтым жа пад'ездзе. Паступова да кансьержкі і яе «заліпання» ў экран далучаюцца іншыя жыхары дома, група людзей каля тэлевізара расце, страх і абурэнне ўсё больш пануюць у іх сэрцах — абсурдная сітуацыя ідзе па нарастаючай. Кансьержка тут актыўнічае больш за ўсіх: гатова некуды тэлефанаваць, «здаваць», скардзіцца і крычаць «на касцёр яго!».

Калі шоу зачаравала ўсіх і кожны думаў нешта накшталт «як я ў ім памыляўся», у пад'ездзе з'яўляецца людаед уласнай персонай, трымае ў руцэ пакет са свежым мясам, крывавая вада капае на падлогу.

Канечне, людаедам ён не быў — у тэлешоу для стварэння неверагоднай гісторыі іграў акцёр. Пакуль усё гэта не было патлумачана, некалькі чалавек здорава спужаліся за сваё жыццё. Але галоўнае не іх трапятанне, а лёгкасць, з якой яны паддаліся ўздзеянню тэлебачання і паверылі ў самую неверагодную інфармацыю.

Асобнай увагі заслугоўвае сама перадача, з наўмыснымі перабольшваннямі, парадыйнасцю, пераігрываннем, стылізацыяй пад вядомыя кожнаму ўзоры. Усё, чым тэлебачанне звычайна разлічвае ўздзейнічаць на абывацеля, тут даведзена да абсурднага і камічнага ўзроўню. Пародыя ўдалая.

Нарэшце, людаедам аказаўся не Дзіма, а тэлевізар. З усімі вынікамі. Пра небяспечныя стасункі з тэлебачаннем «Людаед» кажа выкручастым, але дакладным спосабам пародыі, насмешкі і перабольшвання.

Фільмы «Эстафета» і «Пад шатамі дрэў» стварaліся ў рамках «Кінаспрынту» — праекта, што ў свой час узяўся дапамагаць маладым калектывам кансультацыямі, тэхнікай і прадзюсаваннем стварыць уласныя кінаадзінкі. «Эстафета» аказалася ў тройцы фіналістаў, «Пад шатамі дрэў» студыі BK Films да фіналу конкурсу не дайшоў, але шлях свой працягнуў.

На «Кінаспрынце» аўтары фільмаў працавалі з тэмай экалогіі, што ў выпадку з «Эстафетай» было ўвасоблена з некаторай літаральнасцю і маралізатарствам. У сваю чаргу работа «Пад шатамі дрэў» выкарыстала пэўны кінематаграфічны штамп — эксплуатацыю каштоўных зямель дзеля ўласных небяскрыўдных для прыроды інтарэсаў.

Эгаістычнага дзяльца ў карціне сыграў Мікалай Кірычэнка, а яго пратаганіста — рэжысёр Драматычнага тэатра імя Горкага Барыс Луцэнка. Герой Кірычэнкі, дзелавы чалавек, збіраецца дзеля продажу выкарыстоўваць лес. На лагічнае пытанне «за што?» ён з'язджае на тое, што ў гэтым сяле нічога нікому не патрэбна, таму і хвалявацца няма чаго. Яго аднавяскоўвец, інтэлігент і музыкант, з выглядам прасветленага гуру, які добра атрымаўся ў Барыса Луцэнкі, пачынае працаваць над пэўнай ідэяй, што мусіць паказаць — у людзей, што тут жывуць, ёсць пачуцці, жаданні, клопаты, жыццё.

У глыбінку прыязджаюць музыканты ў фраках, каб выступіць на падрыхтаванай гуру сцэне. Жыхары па запрашэннях прыходзяць на вечарыну і ў гэтай атмасферы раскрываюць увесь свой сентыментальны патэнцыял. Інтуітыўна ці не, сцэна зманціраваная такім чынам, што сантыментам паддаецца і глядач. Як патрабуе класіка штампа, перавыхаванне дзяльца адбылося, прасвятленне таксама, лес выратаваны.

Ці то пасквільная пародыя на раба TV, ці літаральная карціна пра стасункі паміж чалавекам і прыродай — усе яны пра адно — пра чалавека. Выяўляецца тут толькі цікавая дыспазіцыя. Чалавек аказваецца пад небяспечным для розуму ўздзеяннем свайго ж прадукта — тэлевізара, і ў той жа час называе сябе ўладаром прыроды. Кінематаграфісты і нашы маладыя аўтары сказалі пра быццам правільны выбар. Яны хоць паспрабавалі. Памяняць гэтую дыспазіцыю.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

## Гао МАН:

# «ХАЦЕЎ У ЖЫЦЦІ БЫЦЬ ПРОСТА ТРАВОЙ»

**Гэты чалавек — насамрэч легендарная асоба ў фармаце савецка-кітайскіх зносінаў. У Ланьхань (многім вядомы па творчым псеўданіме Гао Ман) яскрава праявіў сябе і ў мастацтве, і ў літаратуры. Прычым у рускім слове працаваў не толькі як перакладчык, але і як глыбокі самабытны публіцыст. Гао Ман — сведка вялікай эпохі, ён пабачыў многіх славутых людзей, перш за ўсё літаратараў: ад Аляксандра Фадзеева да Яўгенія Еўтушэнкі, ад Максіма Танка да Святланы Алексіевіч. Шмат перакладаў, а таксама маляваў партрэты пісьменнікаў розных эпох.**

**Хутка Гао Ман будзе адзначаць слаўную дату — сваё 90-годдзе. Напярэдадні юбілею (па яго шчырым запрашэнні) мы завіталі ва ўтульную пекінскую кватэру майстра, дзе ён жыве разам з жонкай і дачкой. Паўсюль тут — карціны, каліграфія і, вядома ж, кнігі. Пра час, жыццё і пра вечнае Гао Ман расказаў у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе».**



***— Спачатку не зусім па тэме пытанне: чаму ў вас так шмат прыгожых цацак — здаецца, гэта тыгры?***

— Чаму не па тэме? Усё якраз-такі да месца. Гэтыя цацкі насамрэч тыгры, я іх збіраў цягам усяго жыцця. Яны з розных куткоў Кітая і адлюстроўваюць традыцыі. Справа ў тым, што я нарадзіўся ў Харбіне ў год Тыгра — у 1926-м. Ведаеце пра Харбін?

***— Вядома, але пабыць у гэтым горадзе пакуль не давялося. Як я чуў, гэта ўнікальнае месца, дзе асабліва ў 20-30-я гады мінулага стагоддзя ствараўся сімбіёз усходняй і заходняй культуры.***

— Так, я гэтаму быў сведкам. У Харбіне ў той час было шмат выхадцаў з Расійскай імперыі, прадстаўнікі больш чым 20 нацыянальнасцяў — не толькі ўласна рускія, а і прыбалты, украінцы, нават беларусы. У 1930-я гады ў Харбіне жыў і працаваў вядомы публіцыст, празаік Усевалад Іваноў. Пасля я даведаўся, што ён родам з Беларусі — з Ваўкавыска.

У Харбіне вучыўся ў школе і інстытуце Хрысціянскага Саюза Моладзі. Выкладчыкі былі пераважна рускія. Таму рускую мову і культуру я спачатку засвоіў лепш, чым сваё родныя, кітайскія. Нават размаўляў лепш па-руску *(усміхаецца)*. Толькі ў 30 гадоў пачаў старанна штудзіраваць кітайскую літаратуру. На кнігі «захварэў» яшчэ з дзяцінства. У Харбіне было шмат букіністычных крамак, дзе я днямі прападаў. Аднойчы, памятаю, маці дала мне грошай на пэўныя пакупкі, а я на ўсе набыў прыгожы альбом польскіх мастакоў.

***— Маці лаялася?***

— Не, яна мяне вельмі любіла і хацела, каб я вывучыўся. Сама была непісьменнай, але жыццёвую навуку я менавіта ад яе засвоіў. Пра тое, што кожную справу варта даводзіць да завяршэння і рабіць сумленна. З цягам часу разумееш, што родныя, сям'я — жыццёвая аснова кожнага чалавека. Усе мы адтуль пайшлі.

У Харбіне я вельмі захапляўся мастацтвам, першую работу — партрэт Пушкіна — намаляваў у адзінаццаць гадоў. Ужо ў 17 гадоў разам з сябрамі мы правялі тут некалькі сваіх выстаў. У тутэйшай газеце «Дабэйсіньбао» быў надрукаваны мой першы пераклад — верша Івана Тургенева «Как хороши, как свежи были розы». Дарэчы, не найлепшы пераклад, пасля я яго перарабіў. Аднак больш важнае іншае: я адчуў смак творчасці.

***— Пасля навучання ў Харбіне вы працавалі ў таварыстве кітайска-савецкай дружбы. Тады і пачалі актыўна перакладаць літаратурныя творы?***

— Лепшага ўніверсітэта, чым вусны пераклад, для мяне не існуе. Гэта цяжкая паўсядзённая праца, якая многім можа падацца манатоннай і сумнай. Аднак без такой практыкі нельга паўнавартасна брацца за пераклад літаратурных твораў. Мне пашанцавала, бо я перакладаў вядомых пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў — як кітайскіх, так і з усіх куткоў Савецкага Саюза. Шмат ведаў і сваіх калег-перакладчыкаў. Усё гэта многаму мяне навучыла. Тут дробязей не бывае, пакольки варта адчуць усе нюансы, дайсці да сутнасці, перадаць асаблівасці мовы і адметнасці аўтарскага стылю. Найвышэйшая адзнака працы перакладчыка, калі людзі размаўляюць і не адчуваюць яго прысутнасці. Я быў шчаслівы, калі мне казалі: «А мы пра цябе забылі».

Калісьці я лягчэй ставіўся да перакладу — маўляў, звычайная тэхніка, якая з гадамі, з вопытам становіцца лепшай. Але з цягам часу прыйшло разуменне, што гэта надзвычай цяжкая праца. Калісьці я яе назваў танцам у кайданах, які варта так прыгожа выканаць, каб людзі заапладзіравалі. Ты практычна заўжды выходзіш з арыгінала, гэта другая творчасць. Перакладчык выступае ў ролі сааўтара. Мяркуйце самі, славянскія мовы трымаюцца на рытмах, рыфмах, разнастайных граматычных нюансах, а кітайская — на вобразах. Абсалютна розныя падыходы, іншыя стыхіі.

***— Вы не толькі перакладалі, але і малявалі (Гао Ман піша партрэты ў еўрапейскай манеры, але выкарыстоўвае кітайскую тэхніку гохуа — маляванне вадзянымі фарбамі на рысавай паперы. — Аўт.), займаліся каліграфіяй. Стварылі серыю партрэтаў пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, журналістаў. Вельмі незвычайныя працы, напрыклад партрэт Ганны Ахматавай. Ці Пушкін на Вялікай Кітайскай сцяне. Чаму ён там апынуўся?***

— У нас кажуць: калі ты не быў на Вялікай Кітайскай сцяне, то ты не быў у Паднябеснай. У адным з лістоў Пушкін пісаў, што хацеў бы з рускай місіяй паехаць у Кітай, але яму не дазволілі. Затое цяпер ён тут — творчасць паэта шырока вядомая ў Паднябеснай, яго творы шмат перакладаюцца на кітайскую мову, на іх аснове пастаўлены оперы, многія кітайскія мастакі ілюстравалі яго творы. Таму цалкам лагічна было ўявіць яго падчас шпацыру па Вялікай Кітайскай сцяне. Памятаеце яго верш:

*«Поедем, я готов: куда бы вы, друзья,*
*Куда б ни вздумали, готов за вами я*
*Повсюду следовать...*
*К подножию ль стены далекого Китая...»*

Я толькі ўвасобіў мару вялікага рускага паэта. У мяне яшчэ ёсць карціна, якая называецца «Пушкін — Джамалунгма рускай літаратуры».

***— Паэт і найвышэйшая кропка на нашай планеце — сімвалічна. Ці тут таксама ёсць своя гісторыя?***

— Насамрэч ёсць рэальная гісторыя. У 1962 годзе тры кітайскія альпіністы падняліся на Джамалунгму. Адзін з іх — Ван Фучжоу — адмарозіў сабе ногі, але дабраўся да вяршыні. Праз шмат гадоў ён быў у мяне ў гасцях і ўбачыў карціну, прысвечаную Пушкіну. Ён узяў пэндзаль і напісаў «Пушкін — Джамалунгма рускай літаратуры». Пагадзіцеся, Ван Фучжоу меў рацыю. Увогуле, усё высокае мастацтва працягвае сімваламі...

***— ...і працягваецца ў рэальным жыцці. Я чуў, што менавіта дзякуючы перакладам вы пазнаёміліся са сваёй будучай жонкай?***

— Гэта адбылося ў Харбіне. Я пераклаў п'есу «Павел Карчагін», створаную па рамане «Як гартавалася сталь» Мікалая Астроўскага. Яна была пастаўлена калектывам мастацкай самадзейнасці Харбінскай асацыяцыі настаўнікаў. Роль Тоні выконвала артыстка Сунь Цзэ, з ёй я пазнаёміўся, мы пакахалі адзін аднаго і хутка пабраліся шлюбам. І гісторыя мела працяг. Пазней у Кітай прыехала ўдава Мікалая Астроўскага. Ёй спадабаўся мой пераклад, асабліва яе кранула тое, што на пастаноўцы мы пазнаёміліся з жонкай. Раіса Парфір'еўна падарыла фота, на якім яна была знята каля ложка хворага Мікалая Астроўскага. На адваротным баку напісала: «Жадаю вам вечнага шчасця, як усмешка Мікалая Астроўскага на гэтым фота — заўжды ясная і радасная».

***— «Па Беларусі цяжка не сумаваць. Я ездзіў туды аднойчы, але мне ніколі не забыць тыя азёры, лясы, тых сардэчных і гасцінных людзей. Кожны раз, калі сустракаю сяброў з далёкай Беларусі, нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць», — напісалі вы калісьці. Гэтая сувязь з цягам часу не згубілася?***

— З цягам часу гэтая сувязь толькі ўзмацнялася, і наша з вамі сустрэча — яскравае таму пацвярджэнне. Я быў у Беларусі ў далёкім 1954-м, атрымліваецца, 62 гады таму. Тады аднаўляўся галоўны праспект Мінска, будынкі былі пераважна трохпавярховыя. А цяпер, як я бачу па тэлебачанні, у прэсе, ваша сталіца стала прыгожым сучасным горадам. Беларусь — блізкая мне па духу краіна. Я сустракаўся з многімі вашымі літаратарамі, маляваў партрэты пісьменнікаў і паэтаў (Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Танка, Алеся Адамовіча, Васіля Быкава, Святланы Алексіевіч, Навума Гальпяровіча. — **Аўт.**), перакладаў (у 1958 годзе разам з Гэ Баоцюанем пераклаў зборнік вершаў Максіма Танка, аўтар перакладу твора Святланы Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі». — **Аўт.**). Цяпер мне складана з-за праблем са здароўем апэратыўна адсочваць літаратурны працэс. Аднак я ведаю пра тую вялікую працу, якая вядзецца ў Выдавецкім доме «Звязда», у прыватнасці, па стварэнні серыі кніг паэтаў Кітая «Светлыя знакі». Я вітаю такія ініцыятывы і заўжды гатовы іх падтрымліваць.

***— Напрыканцы дазвольце зноў нечаканае пытанне: а чаму ўласна псеўданім Гао Ман, што ён азначае?***

— Бацькі мяне назвалі Сун Юйнань. Гао Ман — адзін з маіх псеўдонімаў, мабыць, найбольш часты ў выкарыстанні. У перакладзе гучыць як «высокія зараснікі». Тут для мяне свой сэнс. У жыцці я хацеў быць проста травой.

***— Дзякуй вам за размову, шчыра зычым здароўя і творчага імпэту. У Беларусі вас памятаюць і ставяцца з вялікай павагай.***

— Прывітанне Беларусі з далёкага Пекіна, ваша цудоўная краіна заўжды ў маім сэрцы.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Мінск—Пекін—Мінск.*

■ Братэрства

## АД ПАМІРА ПРЫВІТАННЕ

**Пабачыў свет «таджыкскі нумар» часопіса «Нёман»**

**У апошняе дзесяцігоддзе досыць плённа развіваюцца беларуска-таджыкскія літаратурныя сувязі. Як сведчанне — сучаснай таджыкскай літаратуры прысвечаны восьмы нумар беларускага літаратурна-мастацкага часопіса «Нёман». Пад адной вокладкай сабраны творы Нізома Касіма, Ато Хамдама, Фарзоны, Гулназара Келдзі, Аскара Хакіма, Джумы Кудуса, Мансура Сурушат і іншых таджыкскіх паэтаў і празаікаў.**

— У гэтым адмысловым нумары, які, спадзяюся, зацікавіць чытача, — гаворыць галоўны рэдактар «Нёмана» перакладчык Аляксей Чарота, — выступае і знакаміты паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Мумін Канаат. Вельмі сімпатычная назва ў яго паэтычнай падборкі — «І свет паэзіі прачнуўся». Ведаю, што ў свой час паважаны Мумін Канаат прыязджаў у Мінск, каб уручыць нашаму Васілю Быкаву прэмію бібліятэкі Дружбы народаў (бібліятэка і зараз працуе на Нурэкскай ГЭС). Ініцыятарам стварэння такой кніжніцы выступіў у свой час часопіс «Дружба народов» на чале з яго галоўным рэдактарам Сяргеем Баруздзіным. Дарэчы, у многім гэтая бібліятэка фарміравалася і кнігамі з аўтографамі народных пісьменнікаў Беларусі Івана Мележа, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Івана Чыгрынава, Петруся Броўкі і іншых беларускіх літаратараў. Кожны лічыў за гонар адправіць сваю новую кнігу на чытанне працаўнікам Нурэкскай ГЭС. Добра было б аднавіць такую традыцыю.

Шмат намаганняў па выпуску «таджыкскага нумара» часопіса «Нёман» прыклалі пісьменнікі з Душанбэ — Ато Хамдам, які, між іншым, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, і Леанід Чыгрын, які нарадзіўся на Віцебшчыне і даўно ўжо жыве ў Таджыкістане.

У апошнія гады ў Душанбэ пабачылі свет кнігі беларускіх пісьменнікаў Алеся Бадака, Георгія Марчука, Юрыя Сапажкова, Міколы Мятліцкага і іншых. А ў 2016 годзе выйшаў «беларускі нумар» часопіса «Памір».

**Сяргей ШЫЧКО**

■

■ Каб памяталі...

## «Пайшоў Пясняр, а песня засталася...»

**Такім пранікнёным радком паэт Сяргей Грахоўскі адгукнуўся на смерць Якуба Коласа. Класіка не стала 60 гадоў таму**

**У дзень памяці Якуба Коласа ў яго доме сабраліся прыхільнікі, паслядоўнікі, духоўныя вучні і спадкаемцы, каб яшчэ раз добрымі словамі ўспомніць любімага творцу. Тут прайшла літаратурная вечарына «Чытаем па-беларуску разам», а на Вайсковых могілках, дзе Колас пахаваны, адбылося ўскладанне кветак на яго магілу.**

Супрацоўнікі Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа таксама прапанавалі незвычайную экскурсію «Спяшаецца сэрца адстукаць свой пай...», якая дала магчымасць перанесціся на 60 гадоў таму і пачуць гукі, якімі суправаджаўся апошні дзень жыцця песняра.

У той дзень, 13 жніўня 1956 года, Якуб Колас з раніцы пайшоў у ЦК КПБ з лістом наконт роднай мовы, але яго па нейкім недарэчным збегу абставін не прынялі. Пісьменнік вярнуўся дадому вельмі ўсхваляваны.

Мы чуем, як адчыняюцца дзверы, гучыць радыё. Колас уваходзіць у пакой і яго выключае. Ён бярэ трубку тэлефона і набірае нейкі нумар, чуе кароткія гудкі, адчыняе шуфляду стала, дастае паперу і пачынае пісаць. Чуем, як стукае сэрца паэта і тахкае гадзіннік...

Адметна, што экскурсія праходзіла ў рабочым кабінеце Коласа, дзе прайшлі апошнія хвіліны жыцця паэта. Пакой захаваўся ў тым самым выглядзе, як і пры жыцці гаспадара. Тут усе рэчы мемарыяльныя, імі карыстаўся паэт. Вось канапа, на якой адпачываў класік, а вось круглы столік з друкаркай, за якім часта працаваў сакратар пісьменніка Максім Лужанін. Ёсць тут і кніжная шафа з прыжыццёвымі выданнямі твораў Коласа. На рабочым стале пісьменніка ўсё таксама засталося, як пры яго жыцці. Партфель, з якім хадзіў на працу ў Акадэмію навук, запісныя кніжкі, гадзіннік.



Фота Кастуся ДРОБАВА

На рабочым стале Якуба Коласа ўсё засталося, як пры яго жыцці.

Пісьмовы прыбор у выглядзе дубовых пянёчкаў, які Коласу падарылі сябры-паэты: яны ведалі, што дуб быў любімым дрэвам класіка і займаў важнае месца ў яго творчасці. А вось календары, якія ляжаць на стале яшчэ з 1956 года, — разгорнутыя на даце 13 жніўня.

З Якубам Коласам развіталіся ў Доме прафсаюзаў. Каб выправіць у апошні шлях любімага творцу, на Цэнтральную плошчу сталіцы (сёння — Кастрычніцкая) прыйшлі тысячы і тысячы беларусаў. У дзень памяці ў музеі Коласа можна было пабачыць рэдкія кадры з кінахронікі, якая распавядала пра пахаванне паэта. Дэманстраваліся таксама і ўрыўкі з фільмаў, у якіх Колас яшчэ жывы. Але і сёння ён жывы — у памяці чытачоў, у вечнасці беларускай літаратуры.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■

## ■ Зачапіла

Рэверс з сеціва

ZVAROT@ZVIAZDA.BY

### Н. Юшкевіч
### «ЯК МОЖНА АДПАЧЫЦЬ НА ПАЛЕССІ?»

*(«Звязда» за 6 жніўня)*

Многія, плануючы адпачынак, адразу схіляюцца да замежных курортаў. Але цяпер, калі не-не ды і пачуеш пра чарговы тэракт або захоп заложнікаў, прычым у самых традыцыйных для турыстаў краінах, мне асабіста ехаць некуды страшнавата. Таму, безумоўна, было цікава пачытаць, чым можа прывабіць Палессе — у прыватнасці, Століншчына. Мне было вядома, што там захаваліся ўнікальныя прыродныя, культурныя помнікі, але не думала, што турысту будзе там утульна. Аказваецца, у глыбінцы для адпачынку ўжо створаны ўмовы.

Чытаючы артыкул, адразу ўяўляеш сабе спакойны, утульны гарадок з добразычлівымі жыхарамі. Асабліва зацікавіла ганчарства, бо ў Беларусі не так шмат ганчарных майстэрань, тым больш такога ўзроўню, каб туды прыязджалі майстры з-за мяжы. Ну і, вядома, заўсёды хочацца даведацца пра мінуўшыну, але так, каб было цікава. Добра, што аўтар распавёў пра віды транспарту, якімі можна дабрацца да таго ж Століна, бо збіраюся з'ездзіць туды з сям'ёй.

**Вольга К.,** *Брэсцкі раён.*

### Д. Лабажэвіч
### ПЕРШЫЯ ДРАМЫ РЫА

*(«Звязда» за 9 жніўня)*

Алімпіяда — гэта, вядома, падзея! Хочацца глядзець на ўсіх і хварэць за кожнага беларуса, нягледзячы на тое, якія віды спорту відовішчныя, а якія — не зусім.

Як гуляюць нашы баскетбалісткі, божа, сэрца спыняецца. І злуешся часам на іх, але і не любіць дзяўчат, якія столькі гадоў аддалі гэтаму віду спорту, немагчыма. Ды і відаць, што самі яны імкнуцца, вельмі хвалююцца. Чытаю розныя прагнозы замежных СМІ пра тое, колькі медалёў будзе ў зборнай Беларусі на Алімпіядзе-2016 і нават не перажываю, што яны прадракаюць нам антырэкорд. Якая розніца, колькі медалёў, галоўнае — колькі эмоцый.

**Алег Раманюк,** *Лугавая Слабада.*

### Н. Нікалаева
### «ГАЛОЎНАЕ НЕ БАЛЫ НА ЦТ, А МАТЫВАЦЫЯ НА АТРЫМАННЕ ПРАФЕСІІ?»

*(«Звязда» за 11 жніўня)*

Тую акалічнасць, што ў дадатковы набор прахадныя балы на педагагічных спецыяльнасцях выраслі, Міністэрства адукацыі чамусьці падае як станоўчы факт. А давайце разам паразважаем, наколькі матываваныя маладыя людзі ўскочылі ў апошні вагон, няхай нават і з больш высокімі баламі. Шчыра кажучы, і 110, і 168 балаў пры паступленні сведчаць пра



вельмі нізкі ўзровень валодання прадметам. Тым, хто паступае ў педуніверсітэт на «фізіку», «матэматыку», «інфарматыку», патрабуецца здаваць на цэнтралізаваным тэсціраванні ў якасці профільных прадметаў фізіку і матэматыку, а гэта самыя складаныя для нашых выпускнікоў дысцыпліны. Прычым такія ж прадметы трэба здаваць і на ўсе тэхнічныя спецыяльнасці, у тым ліку і на прэстыжны ІТ-кірунак. А ці многа вы ведаеце абітурыентаў з высокімі баламі ў сертыфікатах (асабліва па фізіцы), якія выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці? А пераможцаў алімпіяд? Будзем шчырымі: маладыя людзі (асабліва хлопцы, якім трэба ісці служыць у армію) па-ранейшаму разглядаюць педагагічныя спецыяльнасці як запасны аэрадром. Не прайшлі ў БДУІР, БНТУ, БДТУ і тут раптам з'яўляецца апошні шанц. Ну як ім не скарыстацца? Пра якую матывацыю да прафесіі можа ісці гаворка? Не ўпэўнены, што нават у першую хвалю вучыцца на настаўніка фізікі, матэматыкі і інфарматыкі ідуць выключна матываваныя маладыя людзі і гэта іх усвядомлены выбар. А для каго ў такім разе дадатковая магчымасць трапіць на бюджэтнае месца? Атрымліваецца, што для тых, хто не паспеў больш нідзе ўладкаваць свае сертыфікаты? Крыўдна... Застаецца спадзявацца, што ўдасца за чатыры гады «заразіць» іх педагагічнай прафесіяй. Але ж з дрэннага сукна якасны шынель не пашыеш! Ці пашыеш?

**Віталь Палюховіч,** *г. Мінск.*

### Н. Дрындрожык
### «ПАДАРУНАК ІЕМАНЖЫ»

*(«Звязда» за 11 жніўня)*

Воля і Патэрсан — я ад вас у захапленні! Малайцы, што пашыраеце прастору для беларускай мовы, робіце творчыя праекты...

Прачытала артыкул — і стала нейк не па сабе, сорамна. Бразілец вывучыў беларускую мову за шэсць месяцаў і свабодна на ёй размаўляе. А я, беларуска, чакаю з мора пагоды. Шукаю адгаворкі: «няма з кім размаўляць», «мала слоў ведаю», «памылак шмат буду рабіць» і г.д. Таму вырашыла — з гэтага моманту пачынаю гаварыць на роднай мове.

І яшчэ. Вельмі захацелася пачытаць кнігу Патэрсана пра СССР, але не ведаю, дзе яе знайсці... Можа, яе можна набыць у электронным варыянце?

**Ала Маркава** ■

## ■ Простая мова

# РОДНЫЯ — РОЗНЫЯ,

## альбо Тэст на дабрыню

**«Наступны прыпынак «Дом друку» — аб'яўляюць кіроўцы. Прычым кожны будны дзень і каторы год. З дому на працу «сцежка» прывычная — новае бачыцца рэдка.**

**Хіба надоечы?.. Ці не на ўсіх слупах абвестка была: кот прапаў у нейкай сямейцы. І, мусіць, дарагі? Бо таму, хто знойдзе, абяцалі ўзнагароджанне — дзве сотні еўра. А гэта ж грошы!**

**Дык, можа, трэба было, як моладзь кажа, «забіць» на працу? Можа, трэба было пашукаць ката? Яно ж выгадней, калі знойдзеш?**

**І крыўдна, калі — не.**

### Каб ведаў...

Дзень, жнівень, лес, як... храм, бо светлы, бо з мяккай пярынай моху, бо з крапелькамі чарніц і знічкамі ажын, бо з мноствам загадкавых шапак...

Рэдкая асалода шукаць грыбы!

І такая ж... пакута — калі... грыбнікоў, якія толькі што былі, і раптам... зніклі — як скрозь зямлю праваліліся! Мы скрычаліся, можна сказаць, зляталіся, пакуль іх знайшлі, а ўжо ж як напужаліся...

— І было б чаго, — абураецца знойдзены. — Я ж не заблудзіўся, я дарогу ведаў, але пайшоў *нацянькі*...

Наша, прыгожае слоўца!

Акурат такая ж *«пословица»:* «Як пайшоў нацянькі, прахадзіў тры дзянькі».

### Хто пытае, той не блудзіць?

Нехта з гумарыстаў расказваў пра замежнага падарожніка, які папрасіў нашага кіроўцу спыніцца каля бліжэйшай прыбіральні. Той паслухаў і стаў у лесе. Мужчына выйшаў, нейкі час паблукаў і вярнуўся ў аўтобус — так бы мовіць, ні з чым: сказаў, што няма тут ніякіх прыбіральняў.

Гэта, магчыма, анекдот, зараз — чысцюткая праўда. Да знаёмага дзядулі (дом на самым узлеску) з Піцера госці прыехалі. Дарослыя ўзяліся вітацца, малы (тры з паловай гадкі), стулі ўшы ножкі, у дзядулі спытаў: «Дзе тут можна пі-пі?» — «За дрэўца бяжы», — адказаў стары і нават паказаў... Малы хуценька пабег: спачатку — туды і тут жа... назад — ужо з новым пытаннем: «А за каторае дрэўца?»

### Дасць Бог дзень...

Алёна двух цудоўных хлапчукоў нарадзіла сама, а ўжо што чужых прыняла — дык, мусіць, незлічона: прафесія ў яе такая — роды прымаць. Апошнім часам — найбольш партнёрскія, гэта калі ў радзале пакутуе не толькі сама жанчына, але і нехта з блізкіх — яе маці, сястра, муж ці партнёр.

Днямі вось дзядок адзін быў (гадоў пад 70) — са сваёй 40-гадовай сяброўкай. Акушэркам так і казаў: «Калі ласка, падыдзіце да *маёй жанчыны*», «Калі ласка, дапамажыце *маёй жанчыне*»... Вельмі перажываў за яе, а ўжо радаваўся дзіцятку...

Алёна пасля гэтага на ўсялякі выпадак свайму бацечку пазваніла (ён адзін жыве, у разводзе з матуляй), спытала: «Ты там нічога не надумаў? А то ж ведаеш, калі знянацку...»

Калі знянацку, то яно і сапраўды...

А калі падрыхтаваны, то, можа, і нічога страшнага? Як той казаў, дасць Бог дзень — дасць і спажытак: лішні кубачак вады ў гаршчку — дзіцятка і падгадуецца. А ў далейшым жыцці, можа, яму старэйшыя сёстры ды браты дапамогуць...

Калі, вядома ж, ёсць.

### Масла не масленае. І не сметанковае

Вёска, крамка і нават чарга — невялічкая, пераважна з жанчын.

Адна з іх, самая першая, купляе (вушы ж не заткнеш...) колца кракаўскай каўбасы, трыста грамаў цукерак, кіло грыцы...

Што прыемна, прадавачка (і маладое ж зусім дзяўчо) усё разумее, падае — нават тую груцу!..

На масле хіба «асечка» выйшла:

— Вам сланечнікавае? — удакладняе дзяўчына. Пакупніца (відаць, знянацку):

— Не, каровіна.

Хоць па-беларуску масла — яно і ёсць масла. А са сланечніку — гэта алей.

### Не пра каня

У знаёмцаў на лецішчы дуб — звычайны. Ва ўсякім разе — быў, пакуль яны паміж ніжнімі галінамі не нацягнулі... ланцуг, пакуль па ім, «залатым», не пусцілі... ката (выразанага з фанеры), які (ну вядома ж!) «ідзёт налево — песнь заводит, направо — сказку говорит». І тым самым нагадвае... каня — акурат такога ж, «вучонага».

У школу, расказвалі, маладога настаўніка прыслалі. Працуе ён тыдзень, другі, на трэці — даручылі яму вучаніцу праведаць: досыць падрабязна расказалі, дзе яна жыве, падагналі каня.

І добра зрабілі, бо той — гняды ці буланы — куляй, можна сказаць, дамчаў ездака да патрэбнай вёскі. А вось далей пачалося нешта незразумелае, бо конь... спыніўся (прычым каля першай жа хаты), хвілін колькі пастаяў (як ні паганялі), потым спакойным крокам перайшоў да наступнай. І зноўку стаў...

Пасля паездкі высветлілася, што ўзялі яго ў мясцовага паштальёна, які, развозячы пошту, спыняўся каля кожных вясніц, бо ў кожную хату прыносіў калі не пісьмы, дык свежыя газеты.

Былі часы. Некалі.

### Па-нашаму!

У так званым грамадскім транспарце над кабінамі кіроўцаў — іх прозвішчы, імёны (свае, а ніжэй — яшчэ і па бацьку).

Што, вядома ж, добра — гэта інфармацыя падаецца на першай дзяржаўнай мове, прычым досыць пісьменна. Ва ўсякім разе з стырном цяпер усё менш Анатоліяў, Васіліяў ды Генадзіяў, усё больш — Анатоляў, Васілёў, Генадзяў. І нават — Анатолевічаў, Васілевічаў, Генадзевічаў... Без мяккага знака, што па-нашаму, па-беларуску.

### Дзве шкарпэткі — пара

Лета. Лецішча. Суседзі — чужыя, бо калі б, крый Божа, свае, то, мусіць, не знёс бы гэтага пастаяннага і досыць гучнага (бо з гарода ў хату): «Лёнечка, ты паеў?», «...А гарбаткі папіў?», «А пасудак за сабою прыбраў?», «Лёнечка, ты саколку чыстую знайшоў? На канапцы ляжыць... І адзеў?», «Ты пагаліўся?»...

Адказаў на гэтыя бясконцыя пытанні нам не чуваць. Яны... відаць: на ганку праз гадзінку-другую такі з'яўляецца Лёнечка — мажны, пузаты муж гаспадыні. Ён, падобна, цудоўна выспаўся, смачна паеў, пагаліўся, «прыбраўся» ў белую саколку і модныя цяпер аблезлыя, адрэзаныя вышэй каленяў джынсы...

— А на ножках што? — як у дзіцяці, пытае жонка.

— Як гэта што? — не разумее Лёнечка. — Мае шкарпэткі.

— Адна чорная, другая шэрая?

— Затое (муж робіць паўзу) — абедзве цэлыя!

...А галоўнае: гэтую вось пару сабраў ён сам — без жонкі.

### Жаночыя штучкі

Іванаўне яе без малога семдзесят ну ніколі не дасі — рухавая, гаваркая, а ўжо ж прыбраная...

Пляменніца, кажа па сакрэце, крутая-крутая: на два сезоны толькі футры сабе купляе, а ўсё астатняе — разоў колькі адзела і аддала...

Цётка — рада, цётка фарсіць — яшчэ і таму, што рэчы ёй крыху... завялікія. А гэта ж падстава, каб раз-пораз пачуць: «Ой, вы так пахудзелі?!»... І потым усім выглядам сваім адказаць: «Я — змагла! А вы — яшчэ паспрабуйце!»

### Прыкмета

З аўтобуса гэта пасажырка выйшла першай, ледзь ступіўшы на зямлю, пакруціла галавой — пашукала вачыма сметніцу, на хаду кінула ў яе талончык, але прамахнулася — паперка лягла паблізу. Убачыўшы гэта, дзяўчына вярнулася, нахілілася, падняла яе, кінула яшчэ раз.

Акуратыстка, бач... Добрая жонка некаму будзе, добрая нявестка.

### Родныя — розныя...

Што было, было: Дзянісу на дзень народзінаў веласіпед падарылі. Гойсаў на ім, можна сказаць, не злазячы, аж пакуль...

— Уяўляеце, я еду, — заявіў учора з парога, — а з завулка — Жулік... Ды пад колы мне, наперарэз...

— І што — скалечыў сабаку? — насцярожыўся дзед.

— Ровар не зламаў? — адарваўся ад газеты бацька.

— А дзіцятка маё, — пабялела бабуля, — ты сам з таго ровара не зваліўся? Нічога не пабіў?

...Што было, было: тэст — на дабрыню.

**Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by* ■


**НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

**проводит повторный открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного на территории сельсовета**

| № лота | Адрес земельного участка кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | аг. Сергеевичи, ул. Восточная (уч. №2) 624484007701000339 | 0,1320 | Возможность электрификации | 1483,56 | 2810,00 | 5 60,00 |

*Задаток перечисляется на р/с № 6400625110003 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001795, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа 04901, Новопольский сельисполком.* Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

**Аукцион состоится 24 августа 2016 года в 15.00 по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18 августа 2016 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны для справок: (8-017-13) 3-03-16, 3-03-35; сайт Пуховичского райисполкома**: www.pukhovichi/minsk-region.by**

# Пра Святое...



**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)**

Некалі ў Беларусі афіцыйную назву Святое мелі тры населеныя пункты. Адзін з іх — дачны пасёлак, знаходзіцца ў Барысаўскім раёне. Раней гэта была паўнавартасная вёска. У свой час карэнных жыхароў вёскі паклікалі бліжэйшыя гарады і заводы, а цяперашняе насельніцтва наўрад ці ведае гісторыю свайго паселішча. Яшчэ два Святыя паселішчы, і гэта незвычайнае супадзенне, знаходзяцца ў Жлобінскім раёне. Адно з іх у свой час было перайменавана ў Кірава і цяпер з'яўляецца цэнтрам сельсавета, месцам для перасяленцаў-чарнобыльцаў. А маленькая і ціхая Святая на процілеглым баку раёна жыве сваім спрадвечным размераным жыццём

Былыя жыхары любяць сваю вёску і вяртаюцца ў родны край. Хаты не пустуюць. Дзеці-пенсіянеры прыязджаюць глядзець сваіх састарэлых бацькоў і матуль, з ранняй вясны да позняй восені працуюць на агародах, увіхаюцца па гаспадарцы. Дамы купляюць і пад дачы. Пра гэта я даведаўся ад вяскоўцаў, пахадзіўшы па Святому, пачуў ад іх шмат цікавага. Сёння ў вёсцы стала жыве дзесяць жыхароў, але ў дачны перыяд іх больш ае ўтрая.

Сярод тых, хто не забывае родны парог, і Уладзімір Захарошка. Яго дзед, бацька і нават маці былі пчалаводамі. І сын па традыцыі працягвае сямейную справу. Яшчэ да выхаду на заслужаны адпачынак пачаў прыязджаць са сталіцы, а гэта амаль дзвесце кіламетраў. У ягоным пчальніку трыццаць вулейчыкаў і некалькі старых борцяў — дзедава спадчына.

— У дзяцінстве я дапамагаў бацьку, дзяжурыў у час раення на пчальніку, лавіў раі, — кажа аўтарытэтны пчаляр Святога. — Развядзенне пчол і збор мёду патрабуюць цярпення і ўвагі.

Жыхары вёскі ласкава называюць яго «мядовікам». Па прыкладзе Уладзіміра некалькі вяскоўцаў сталі захапляцца клопатнай, але карыснай справай. Яго сусед Валянцін Дудараў — таксама малады пенсіянер (толькі выйшаў на пенсію), ахвотна асвойвае сакрэты абыходжання з пчоламі. Валянцін і Уладзімір амаль равеснікі, раслі побач, родная вёска іх зноў звяла...





Легенда аб тым, што назва населенага пункта паходзіць ад аднайменнага возера пацвярджэння ў вяскоўцаў не атрымала. Людзі кажуць, што на іх памяці на месцы возера ўжо была дрыгва, а на ёй хіба некалькі акенцаў вады. Мая вандроўка па пошуку зніклага возера нічым не ўвянчалася. Убачыў толькі зарослы канал і невялічкае люстэрка «святой» вады. Не памятаюць возера і самыя старэйшыя жыхары Павел Талкачоў і Марыя Маркава, якія нарадзіліся за тры гады да вайны. Адзінае, што яны прыгадваюць, — у сярэдзіне пяцідзясятых праводзілася меліярацыя, выкарчоўвалі кусты, вялі каналы. Назва вёскі ад назвы Святога возера ім падаецца надуманай.

Жыхары схіляюцца да думкі, што пасёлак узнік дзякуючы перасяленцам з іншай вёскі Святое, якая месціцца ў іншым баку ад Жлобіна (цяпер гэта вёска Кірава). Ёсць прамыя доказы гэтаму факту. Напрыклад, бацьку Марыі Маркавай у 12-гадовым узросце перавезлі (у 1912 годзе) з той самай вёскі. Напэўна, «мігранты» назвалі новае месца жыхарства ў гонар былой радзімы. Магчыма, архіўныя дакументы яшчэ пральюць святло на падзеі стогадовай даўніны, калі хто захоча капнуць глыбей гісторыю вёскі. Але, на жаль, Святое пакуль не займела свайго летапісца.

І ўсё ж першыя спробы вывучыць гісторыю (праўда, пакуль што сваёй сям'і) робіць Валянцін Дудараў з жонкай Надзеяй. Вярнуўшыся на радзіму, яны вырашылі аднавіць свой радавод, прыгадалі дзядоў-прадзедаў, радню. Дзеці паклапаціліся наконт камп'ютарнай графікі, і атрымалася сапраўднае радаводнае дрэва. Графіку ў выглядзе дуба ўзялі ў рамку і павесілі на самым відным месцы бацькоўскага дома. У паўсядзённых размовах і за сяброўскім сталом успамінаюць сваіх папярэднікаў, падзеі, якія яны перажылі.

Вайна ў гісторыі Святога стаіць асобным радком. Цяжка даліся яму тры гады акупацыі. Дзяцей забіралі ў дзіцячы лагер ў Красны Бераг, многія мужчыны не вярнуліся з фронту.

Пра сваю вайну расказаў і Павел Талкачоў. Субяседнік аказаўся сціплым, адмовіўся пазіраваць перад фотакамерай. У пачатку сакавіка 1944 года некалькі вясковых сямей вывезлі ў канцэнтрацыйны лагер пад Азарычамі. 6-гадовы Павел патрапіў за калючы дрот разам з маці, дзедам і дзядзькам. Лёс пашкадаваў сям'ю — усе выжылі. У канцы чэрвеня вязняў вызвалілі чырвонаармейцы. А вось яго бацька не дажыў да Дня Перамогі, загінуў, вызваляючы Беларусь: на магіле пад Светлагорскам пазначана яго імя...

Святое для сям'і пенсіянераў Аляксея і Таццяны Сідакіных стала другой радзімай. Раней пара жыла ў Бабруйску, а па прыкладзе родных Таццяны знайшлі ў вёсцы з незвычайнай назвай прыдатны дом, абжыліся, завялі жыўнасць. Цяпер у іх цэлы статак коз, а лішкі казінага малака аддаюць вяскоўцам.

Суседак Зінаіду Кутоўскую і Марыю Маркаву — былых калгасніц, у вёсцы называюць майстрыхамі вышывання. У паважаным узросце яны ўсё яшчэ рукадзельнічаюць, цікавяцца навінкамі «жаночага» мастацтва, дораць свае творы дзецям і ўнукам. Зімовыя дні бавяць за іголкамі і ніткамі, успамінаючы маладыя гады. Бабуля Марыя была звеннявой па вырошчванні кукурузы квадратна-гнездавым спосабам. А Зінаіда Мікалаеўна працавала на ферме цялятніцай. Цяпер Зінаіду Кутоўскую, як самую бойкую і рашучую з вяскоўцаў, надзялілі грамадскім абавязкам — быць старастам.

Цэнтр прыцягнення ў Святым — аўталаўка. Тры разы на тыдзень прыязджае ў вёску крама на калёсах. Едзе па ўсёй вёсцы, разварочваецца, сігналіць. Адзінае дзіця і самая маленькая жыхарка вёскі Аляксандра Захарошка радуецца больш за ўсіх — кожны раз бацькі купляюць у краме для яе ласункі. Яна першая выглядвае з веснічак, цікуе. Каля магазіна збіраюцца ўсе гаспадыні, як заўсёды дзеляцца апошнімі навінамі.

Апошняй у Святым была навіна пра тое, што маланка забіла сямігадовую кабылу. Гэта здарылася на падворку самай маладой сям'і ў тыя грымотныя і ўраганныя дні гэтага лета. Было ад чаго бедаваць жывёлаводу сельгаспрадпрыемства «Краснабярэжскі» Віталію Захарошку — чатыры месяцы таму ён купіў гэтага каня, ездзіў на ім на работу, працаваў. І на табе... Але ў ноч перад тым, як здарылася непапраўнае, кабыла ажарабілася, і цяпер у сям'і новы клопат — выгадаваць Буянчыка, які застаўся без маці. Нездарма кажуць: бяда і радасць ходзяць разам.

Больш беларускі тарнада бяды ў Святым не нарабіў. Можа, сакральная назва дапамагла?

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
*Жлобінскі раён.*

**Фота аўтара.**
***Больш фотаздымкаў глядзіце на партале «Звязды».***


# ПАМЯНЯЙЦЕ ЧЭКІ НА КЛЮЧЫ!

## Першы дом у жылым комплексе «Вясёлкавы» ўводзіцца ў эксплуатацыю

**Купіць кватэру тут можна ад 25 540 долараў ЗША па курсе Нацыянальнага банка на дзень аплаты. Кошт метра квадратнага застаецца нязменным: ад 630 у.а.**

Будаўніцтва жылога комплексу пачалося зімой гэтага года, і вось ужо ў хуткім часе першыя жыхары аднаго з дамоў атрымаюць ключы. Літаральна праз пару месяцаў змогуць засяляцца і пакупнікі другога дома — ён поўнасцю дабудаваны і цяпер у ім адбываецца апрацоўка месцаў агульнага карыстання. Усяго ў праекце комплексу «Вясёлкавы» — 8 дамоў на асобнай тэрыторыі. Комплекс вылучаецца ўласнай інфраструктурай для актыўнага і камфортнага жыцця. У крокавай дасягальнасці — школы, дзіцячыя садкі, магазіны, паліклініка, бальніца, цырульня, басейн. Непадалёку — вадаём і прасторны парк.

Размяшчаецца «Вясёлкавы» ўсяго за 26,9 км ад сталіцы — у Дзяржынску. Пераадолець такую адлегласць можна ўсяго за 20 хвілін. Паміж гарадамі рэгулярна ходзяць аўтобусы, маршрутныя таксі, ёсць і гарадская лінія цягнікоў.

Зусім неабавязкова ўносіць усю суму адразу — можна скарыстацца беспрацэнтнай растэрміноўкай да 2018 года або пагасіць да 70 працэнтаў ад кошту кватэры з дапамогай выгаднага рублёвага крэдыту ад банка-партнёра.



Прыязджайце ў офіс і даведайцеся больш пра зніжкі і бонусы:
**г. Мінск, вул. Няміга, 3, офіс 403.**
**www.sbf.by.**
Званіце па нумарах:
**+375 17 204-88-42,**
МТС **+375 29 539-11-30,**
Velcom **+375 29 168-70-68.**
УНП 691605208

Засяленне ў кватэру адбудзецца адразу пасля ўводу дома ў эксплуатацыю, незалежна ад растэрміноўкі.

Дарэчы, можна сэканоміць на рамонце дзякуючы гатоваму базаваму адстройванню — чыставыя сцяжкі, шпаклёўка на сценах. У камплектацыю новай кватэры ўваходзяць металічныя дзверы, двухкамерныя шклопакеты, зашклёныя лоджыі, ва ўсіх пакоях ужо ўстаноўлены алюмініевыя радыятары ацяплення, разеткі і выключальнікі, на кухні — газавая пліта, у санвузле — унітаз, поўнасцю гатовая ўжо гідраразводка і падключаны лічыльнікі. У жылым комплексе «Вясёлкавы» памяшканні аснашчаны дамафонам, праведзена оптавалаконная лінія сувязі. Высакахуткасны інтэрнэт і лічбавае тэлебачанне даступныя з першых дзён засялення. Камфортную тэмпературу і паступленне цёплай вады круглы год забяспечаць пакватэрна ўстаноўленыя ацяпляльныя катлы прэміум-класа (Viesmann).

Генпадрадчык жылога комплексу «Вясёлкавы» — Салігорскі домабудаўнічы камбінат — дзяржаўная кампанія, якая спецыялізуецца на панэльным домабудаўніцтве і паспяхова працуе на рынку нерухомасці больш за 35 гадоў.

Жылы комплекс «Вясёлкавы» — адзін з нямногіх, дзе можна рэалізаваць чэкі «Жыллё», аплаціць імі новабудоўлю! Як вядома, з 1 ліпеня дзеянне чэкаў абмежаванае — з іх дапамогай ужо нельга прыватызаваць кватэру. Калі вы з ліку ўладальнікаў гэтых каштоўных папер, такая прапанова павінна вас зацікавіць.



**РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона
по продаже права заключения договора аренды
сроком на 5 (пять) лет**

# БАЗЫ ОТДЫХА «ХАТКИ»,

**принадлежащей УП «Барановичское отделение
Белорусской железной дороги»
на праве хозяйственного ведения**

| | | | Начальная цена продажи права с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | 1. Домик для отдыха № 1 с инв. № 110/С-106497. 2. Домик для отдыха № 2 с инв. № 110/С-106496. 3. Домик для отдыха № 3 с инв. № 110/С-106495. 4. Домик для отдыха № 4 с инв. № 110/С-106494. 5. Домик для отдыха № 5 с инв. № 110/С-106499. 6. Домик для отдыха № 6 с инв. № 110/С-106493. 7. Корчма с инв. № 110/С-106490. 8. Дом сторожа с инв. № 110/С-106489. 9. Мастерская с инв. № 110/С-106492. 10. Физкультурно-оздоровительный комплекс с инв. № 110/С-106500. 11. Трансформаторная подстанция с инв. № 110/С-106491. 12. Благоустройство с инв. № 110/С-110596. Целевое назначение – размещение базы отдыха. | Брестская обл., Барановичский р-н, Жемчужненский с/с, 385/8, 385/6, 385/7, 385/5, 385/4, 385/9, 385/1, 385, 385/2, 385/3, 385 1 км южнее д. Детковичи; Брестская обл., Барановичский р-н, д. Хатки | 4 701,86 (47 018 600)* | 470,19 (4 701 860)* |

()* – цена указана в денежных знаках образца 2000 г.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 1,5158 га с кадастровым номером 120400000001000899, на праве постоянного пользования. Целевое назначение – для обслуживания оздоровительной базы отдыха «Хатки».

Аукцион состоится **15.09.2016 в 11.00**, прием заявлений в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу Организатора аукциона. Шаг аукциона – 5%. Окончание приема заявлений – **13.09.2016 в 12.00.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды базы отдыха «Хатки», принадлежащей УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», проводимом 15 сентября 2016 г.
Полный текст извещения о проведении аукциона, в том числе порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона, условия оплаты, размер штрафа, содержатся на сайте Ораганизатора аукциона **ino.by.**
Все желающие могут ознакомиться со сдаваемым в аренду имуществом. Контактное лицо: Нацкович Юрий Анатольевич, 8 (0163) 49-50-34, 8-029-366-81-46.

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3 этаж • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Не такія

# АЛЬБІНОСЫ: ПАМІЖ МІФАМІ І РЭАЛЬНАСЦЮ

**Гэтыя незвычайныя людзі лічацца ледзьве не самымі загадкавымі на нашай планеце. Яны атрымалі назву ад лацінскага слова «albeus», што значыць «белы». Па змрочных народных павер'ях, на альбіносах ляжыць праклён, у іх не бывае дзяцей, а іх органы можна выкарыстоўваць у якасці чароўнага талісмана падчас вядзьмарскіх рытуалаў.**

Вядома, не ўсім са шматлікіх міфаў трэба верыць. Па сутнасці, альбіносы мала чым адрозніваюцца ад звычайных людзей. Іх галоўная непадобнасць — у адсутнасці пігментацыі, іх лёгка распазнаць па бясколерных вейках, малочна-белых валасах і празрыстай скуры. У гэтага феномена часам сустракаюцца пабочныя сімптомы, якія прыводзяць да праблем са зрокам або павышанай адчувальнасці да сонечнага святла; зрэшты, такія ўскладненні паддаюцца лячэнню.

Нягледзячы на тое, што часы «палявання на вядзьмарак» даўно прайшлі, альбіносаў і сёння часта дражняць, грэбуюць імі ці падымаюць на смех. Акрамя таго, сама гэтая з'ява па-ранейшаму выклікае ў людзей мноства пытанняў, сумненняў і прадузятасцяў. Каб хоць крыху змяніць сітуацыю, мы сабралі навуковыя факты, якія даюць адказы на пытанні, чаму некаторыя людзі нараджаюцца альбіносамі, ці небяспечна гэта для навакольных і ці сапраўды працягласць жыцця альбіноса значна меншая за працягласць жыцця звычайнага чалавека.

Альбінізм, які часам яшчэ называюць гіпапігментацыяй, належыць да прыроджаных генетычных адхіленняў. Прычынай гэтай асаблівасці з'яўляецца частковая або поўная адсутнасць меланіну — пігменту, які адказвае за афарбоўку нашай скуры, вачэй і валасоў. Адзначым: на сёння не існуе штучных спосабаў прымусіць арганізм выпрацоўваць меланін.

У альбіноса ёсць такая самая магчымасць пражыць доўгае, шчаслівае і здаровае жыццё, як і ў любога іншага чалавека. Самую вялікую небяспеку для альбіносаў уяўляюць прамыя сонечныя прамяні, таму такія людзі не здольныя загараць і часцей за іншых пакутуюць ад сонечных апёкаў і, адпаведна, ракавых захворванняў скуры.

Сярод людзей вельмі распаўсюджана памылковая думка, быццам альбіносы маюць ружовыя або наогул чырвоныя вочы, хоць насамрэч радужная абалонка іх вачэй можа быць любога адцення: ад светла-шэрага да блакітнага (што сустракаецца найчасцей), а ў рэдкіх выпадках нават цёмнага. З-за адлюстраванага святла вочы альбіносаў часам здаюцца чырвонымі— дакладна гэтак сама, як на фотаздымках з'яўляецца эфект чырвоных вачэй, калі пры недастатковым асвятленні камера фіксуе адлюстраванне фотаўспышкі ад вочнага дна.

Альбіносы, дарэчы, сустракаюцца не толькі сярод людзей, але і ў жывёльным свеце, прычым у некаторых краінах такія незвычайныя істоты цэняцца літаральна на вагу золата. Напрыклад, карэнныя народы Амерыкі шануюць белага бізона, які ўвасабляе для іх уладу і поспех, і ніколі не зробяць такой жывёле шкоды. А галоўны амерыканскі раман XIX стагоддзя «Мобі Дзік, або Белы кіт» пісьменніка і марака Германа Мелвіла распавядае пра ўпартае супрацьстаянне гіганцкага кіта-альбіноса па мянушцы Мобі Дзік і капітана кітабойнага судна. Напаўфантастычнаму бялюткаму кіту, які жыў недалёка ад чылійскай выспы Мача ў паўднёвай частцы Ціхага акіяна, кожны раз удавалася сысці жывым і цэлым ад апантаных прагай помсты кітабояў. За гэта ён адказвае сваім мучыцелям яшчэ большай жорсткасцю.



Па вялікім рахунку, ген альбінізму не лічыцца рэдкасцю, паколькі яго схаваным носьбітам з'яўляецца прыкладна кожны сямідзясяты чалавек у свеце. Верагоднасць з'яўлення на свет дзіцяці-альбіноса складае 25%, калі такія гены маюць абодва бацькі. Калі ж дзіця атрымае ў спадчыну адзін нармальны і адзін дэфектны ген, то нармальны ген будзе вырабляць дастатковую колькасць меланіну. Сёння навукоўцы могуць з упэўненасцю сказаць, ці з'яўляецца хто-небудзь з бацькоў носьбітам гена-альбіноса: для гэтага неабходна пратэставаць валасяны фалікул чалавека на выпрацоўку меланіну. У сярэднім у свеце на кожныя дваццаць тысяч чалавек — адзін альбінос, хоць у асобных краінах гэтая лічба можа моцна адрознівацца і нават дасягаць неверагодна высокіх паказчыкаў — напрыклад, у некаторых рэгіёнах Афрыкі альбіносам нараджаецца кожны 3-тысячны жыхар.

У прыродзе, між іншым, існуюць і іншыя віды парушэнняў пігментацыі вонкавага покрыва. Да найбольш распаўсюджаных анамалій адносяцца эрытрызм і ксантызм, гэта значыць прыроджанае дамінаванне чырвонага або жоўтага колераў, а таксама вітыліга — утварэнне на скураным покрыве гладкіх абясколерных участкаў. Пацыенты з дыягназам вітыліга сустракаюцца і сярод сусветна вядомых людзей: так, не сакрэт, што ад гэтага захворвання пакутаваў нябожчык поп-спявак Майкл Джэксан і канадская топ-мадэль Віні Харлоу.

Альбіносы нярэдка схільныя да розных захворванняў вачэй, самымі распаўсюджанымі з якіх з'яўляюцца блізарукасць і святлабоязь. Адным з самых цяжкіх відаў альбінізму лічыцца сіндром Германскі-Пудлака. Людзі, у якіх ён дыягнаставаны, схільныя да частых крывацёкаў і сінякоў нават пры зусім нязначных па сіле ударах.

У Танзаніі, дзе пражывае найбольшая на афрыканскім кантыненце колькасць альбіносаў, па-ранейшаму існуе пагардлівае стаўленне да бледнай скуры. Сярод напаўпісьменнага негрыцянскага насельніцтва Усходняй Афрыкі існуюць прымхі, што чарнаскурыя маці дзяцей-альбіносаў здраджваюць сваім мужчынам з белымі мужчынамі, або што такія дзеці, народжаныя ад чарнаскурых бацькоў, з'яўляюцца прывідамі былых еўрапейскіх каланізатараў.

У заключэнне варта дадаць, што альбінізм не ўяўляе небяспекі для людзей, бо з'яўляецца генетычным захворваннем і не перадаецца ніякім іншым чынам. Спадзяёмся, што наяўнасць у чалавека падобнага захворвання не паўплывае на ваша стаўленне да яго. Не прыходзіць жа нам у галаву адчуваць прыязнасць або непрыязнасць да бландзінаў і брунетаў толькі таму, што яны з'яўляюцца носьбітамі генаў, якія адказваюць за цёмныя або светлыя валасы ■

■ Пашанцавала

# ВЫПАДКОВЫЯ СКАРБЫ

**Каб знайсці скарб, неабавязкова быць піратам або археолагам. Часам дастаткова проста згубіць малаток — і скарбы самі скокнуць да вас у рукі, піша vokrugsveta.ru.**

**1 згублены малаток** дазволіў знайсці найбуйнейшы на Брытанскіх астравах скарб з рымскага золата і срэбра. У 1992 годзе фермер Пітэр Уотлінг згубіў малаток на полі і папрасіў прыяцеля прыйсці з металашукальнікам. Сябры знайшлі і інструмент, і 15 000 рымскіх залатых, сярэбраных і бронзавых манет, упрыгажэнні і каштоўны посуд. Скарб за 1,75 млн фунтаў стэрлінгаў набыў Брытанскі музей, а малаток стаў часткай экспазіцыі.

**22 млрд долараў** — кошт самага буйнога ў гісторыі скарбу. Ён знойдзены ў 2011 годзе ў падземных сховішчах індуісцкага храма ў горадзе Трывандрам (штат Керала, Індыя). Агулам гэта каля трох-чатырох тон золата і вырабаў з яго.



**2700 гадоў** праляжалі 20 кілаграмаў залатых артэфактаў у кургане Аржан-2 у Туве, пакуль у пачатку 2000-х гадоў іх не вынялі археолагі. Усяго навукоўцы знайшлі амаль 1200 унікальных багата інкруставаных прадметаў.

**У 1349 годзе** габрэй-ліхвяр падчас чумных пагромаў, якія пракаціліся па Еўропе, схаваў недалёка ад сінагогі ў нямецкім горадзе Эрфурт 3141 сярэбраную манету, 14 сярэбраных зліткаў і каля 700 каштоўных вырабаў агульнай вагой 24 кг. Скарб знайшлі ў 1998 годзе.



**70 залатых торквесаў** (кельцкіх нашыйных упрыгажэнняў) I стагоддзя да н. э. было знойдзена з 1948 па 1973 год у Норфалку (Вялікабрытанія). Агульны кошт артэфактаў — 11,6 млн фунтаў стэрлінгаў.

**3500 артэфактаў** агульнай вагой 5,1 кг золата і 1,4 кг серабра, датаваных VII—VIII стагоддзямі, знайшоў у 2009 годзе ў графстве Стафардшыр шукальнік-аматар Тэры Херберт. Найбуйнейшы скарб англасаксонскага перыяду гісторыі ацанілі ў 3,3 млн фунтаў стэрлінгаў.

**1427 залатых долараў**, адчаканеных у 1847—1894 гадах, знайшлі ў Каліфорніі (ЗША) у лютым 2013 года. Намінал манет са скарбу складае 27 500 долараў, рынкавы кошт знаходкі на момант выяўлення — 10 млн. Эксперт па ацэнцы манет Дэвід Хол тлумачыць высокі кошт знаходкі 2013 года захаванасцю грошай: яны



не былі ў звароце. 10 000 000/27 500 = 363,6 — у столькі разоў вырас кошт залатых долараў са скарбу ў Каліфорніі з канца XIX стагоддзя да 2013 года. За той жа перыяд часу аналагічная сума ў звычайных доларах з улікам інфляцыі вырасла толькі ў 28 з паловай разоў.

**1 метр** — на такой нязначнай глыбіні былі закапаныя падчас Другой сусветнай вайны ў лесе, які мяжуе з фамільным замкам Морыцбург (Саксонія, Германія), 40 драўляных скрыняў з каштоўнасцямі дынастыі Вецінаў. Большую частку знайшлі яшчэ ў 1945 годзе савецкія вайскоўцы і вывезлі ў СССР. Ацэначны кошт пакінутых скарбаў (посуду і ўпрыгажэнняў), знойдзеных у 1996 годзе, складае больш за 4 млн долараў.

**95 гадоў** у патайным пакоі ў адным з асабнякоў Санкт-Пецярбурга захоўваліся фамільныя каштоўнасці роду Нарышкіных. Мяркуючы па знойдзеных газетах, скарб схавалі восенню 1917 года, а знайшлі пры правядзенні рэстаўрацыйных работ вясной 2012-га. Усяго знойдзена 2186 прадметаў (каштоўнасці, сталовы посуд, узнагароды). Скарб быў ацэнены ў 189 мільёнаў рублёў.



**750 кг** дасягае вага скарбу манет I стагоддзя да н. э., які знайшлі на востраве Джэрсі (Вялікабрытанія) у 2012 годзе двое аматараў з металашукальнікамі. Там было больш за 70 000 манет, кошт якіх цяпер ацэньваецца ад 7 да 14 млн фунтаў стэрлінгаў.

**XIV стагоддзем** датуецца скарб, знойдзены ў 1980-х гадах пры правядзенні будаўнічых работ у польскім горадзе Сьрода-Слёнска. У ліку знойдзеных артэфактаў — больш 3000 сярэбраных і 39 залатых манет, а таксама кулоны, пярсцёнкі і іншыя ўпрыгажэнні, у тым ліку залатая карона, якая належала, як мяркуецца, каралеве Чэхіі Бланцы Валуа.



**14 гадоў** у сакрэтным сховішчы Нацыянальнага банка Афганістана ў таямніцы ад усяго свету знаходзілася калекцыя так званага бактрыйскага золата. Гэта больш за 22 000 залатых артэфактаў I стагоддзя да нашай эры ■

■ Дайджэст

## Галаграмы на змену мабільнікам?

**Фантастычныя фільмы дэманструюць нам недалёкую будучыню, у якой галаграфічныя інтэрфейсы і сродкі сувязі будуць распаўсюджаны практычна паўсюдна. І хоць да падобнага прымянення тэхналогіі яшчэ далёка, набыць галаграфічны экран можна ўжо сёння.**

Параўнальна нядаўна на вялікай сцэне былі «ўваскрэшаныя» ў выглядзе галаграмы Фрэдзі Меркуры і Тупак Шакур. Гэтая, без сумневу, эфектная дэманстрацыя ўсё ж не надта цягнула на выхад у масы, бо апаратура, задзейнічаная ў працэсе, была вельмі складанай у абслугоўванні і займала зашмат месца. Але зусім нядаўна стартап HoloVit ад кампаніі з аднайменнай назвай выйшаў за рамкі прататыпа і ўжо збірае на краўдфандзінг-пляцоўцы заказы на пастаўку першай партыі для ўсіх ахвотных.



Сістэма вельмі простая ў карыстанні: для яе спатрэбіцца толькі спецыяльны празрысты экран і планшэт, тэлевізар, смартфон або наўтбук у якасці праектара. Прыладу-праектар дастаткова ўсталяваць на вызначанай адлегласці ад экрана, запусціць праграму HoloVit і, ласна кажучы, усё. Хатняя галаграма гатовая да выкарыстання. На жаль, на гэты момант сістэма пабудаваная такім чынам, што любы відэафрагмент задзейнічаць у якасці галаграмы не атрымаецца. Затое распрацоўшчыкі прадастаўляюць інструментарый для перакладу відэа ў фармат, які прайграе HoloVit, а таксама даюць магчымасць выкарыстоўваць у якасці галаграмы відэа, запісанае з дапамогай любой камеры на чорным фоне.

У асартыменце прадстаўлены тры віды экранаў, якія адрозніваюцца памерам дыяганалі. Самая маленькая мадэль каштуе 79 долараў.

## 20% усёй ежы ў свеце становіцца смеццем

**Да такой высновы прыйшлі спецыялісты Патсдамскага інстытута вывучэння кліматычных змен, завяршыўшы першае ў гісторыі комплекснае даследаванне праблемы перавытворчасці харчовых прадуктаў.**



Ацаніць дакладныя аб'ёмы харчовых адходаў немагчыма, таму статыстыкі карысталіся ўскоснымі метадамі. Для 169 краін, у якіх пражывае 98% насельніцтва зямнога шара, вылічылі велічыню лішкаў харчавання. Лічбу атрымалі як розніцу паміж колькасцю харчовых прадуктаў, якія краіна вырабляе для ўнутранага спажывання і імпартуе (у кілакалорыях), і колькасцю энергіі, якая неабходна насельніцтву краіны. Высветлілася, што ў 1965 годзе ў сярэднім на чалавека прыходзілася 310 лішніх калорый штодзень, а ў 2010-м — ужо 500. Ведаць дакладна, што ежа, якая складае гэтыя 510 ккал, выкідваецца, немагчыма. Цалкам верагодна, што людзі проста спажываюць больш прадуктаў, чым ім трэба. Каб улічыць гэты факт, статысты ўключылі ў разлік звесткі пра людзей з лішняй вагой.

Каб уявіць, як выглядаюць гэтыя калорыі, задумайцеся: калі ў 1965 годзе мы выкідвалі тры вялікія яблыкі штодзень на чалавека, то шэсць гадоў таму ўжо пяць яблыкаў адпраўлялася ў смецевы бак. Чым вышэйшы ўзровень жыцця ў краіне, тым больш прадуктаў прападае. На харчовыя адходы прыходзіцца 20% усёй вырашчанай, упакаванай і дастаўленай спажыўцу ежы. Калі чалавецтва знойдзе спосаб пакласці канец гэтай праблеме, то да 2050 года можна будзе пракарміць 9-мільярднае насельніцтва, захаваўшы сённяшні аб'ём сельскагаспадарчай вытворчасці.

## У Брытаніі часцей за ўсё кусаюцца лабрадоры

**Брытанскія даследчыкі вызначылі пароду сабак, прадстаўнікі якой часцей за ўсё нападаюць на людзей. Больш за ўсё іскаў аб кампенсацыі асабістага ўрону пасля нападу жывёл у краіне было пададзена з-за лабрадораў.**

Даследаванне правялі эксперты кампаніі Animal Friends, якая займаецца страхаваннем жывёл. Высветлілася, што лабрадоры, якіх называюць лепшымі сябрамі дзяцей, апынуліся заклятымі ворагамі паштальёнаў — амаль у трацінах інцыдэнтаў удзельнічалі кур'еры і супрацоўнікі пошты. Мужчын лабрадоры кусалі значна часцей, чым жанчын. За 2015 год толькі Каралеўская паштовая служба зафіксавала 2,6 тысячы выпадкаў нападаў на сваіх супрацоўнікаў.

На думку спецыяліста па псіхалогіі жывёл Роджэра Магфорда, сабакі нападаюць на незнаёмцаў, што прыходзяць у дом, успрымаючы іх пагрозу сваёй «зграі» — сям'і. Летам атакі пачашчаюцца на дзесяць працэнтаў, калі дзеці і свойскія жывёлы праводзяць шмат часу ў садзе. Магфорд раіць паштарам заводзіць сяброўства з мясцовымі сабакамі і «падкупляць» іх пачастункам. На ягоны думку, сабакі запамінаюць людзей і не будуць кусаць таго, хто добра да іх ставіцца. Акрамя лабрадораў, на людзей часцей за ўсё нападаюць нямецкія аўчаркі, стафардшырскія бультэр'еры і бордар-колі



■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «Статусныя падарункі ад А-100. 1»

**Настоящие Правила разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Статусныя падарункі ад А-100.1» (далее – Игра), проводимой в целях стимулирования реализации продаж нефтепродуктов, сопутствующих товаров (за исключением пива, слабоалкогольных, алкогольных напитков и табачных изделий) и услуг через автозаправочные станции АЗС ОДО «Астотрейдинг» в г.Минске, Минской области, Брестской области.**

**1. Организатор Игры.**
Организатором Игры является Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения; УНП 690362737; e-mail: a-100@a-100.by

**2. Наименование игры.**
Игра носит название «**Статусныя падарункі ад А-100.1**».

**3. Участники Игры.**
В Игре могут принять участие дееспособные физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и имеющие вид на жительство в Республике Беларусь.
Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Права участников Игры.**
Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие Призы.
Каждый Участник может принять участие в Игре три раза, но не более одного раза в каждом этапе Игры.

**5. Сроки проведения Игры.**
Начало Игры: 15 августа 2016 года.
Окончание Игры: 23 сентября 2016 года.

**6. Территория проведения Игры:**
Республика Беларусь, а именно, территория, на которой расположены автозаправочные станции ОДО «Астотрейдинг» (далее – АЗС ОДО «Астотрейдинг»): г. Минск, Минская область, Брестская область.

**7. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Игра.**
Игра проводится в целях стимулирования реализации продаж нефтепродуктов, сопутствующих товаров (за исключением пива, слабоалкогольных, алкогольных напитков и табачных изделий) и услуг.

**8. Призовой фонд.**
Призовой фонд Игры указан в Таблице ниже:

| | Наименование | Кол-во, шт. | Цена с НДС, бел. руб. в денежных знаках 2009 года | Общая стоимость с НДС, бел. руб. в денежных знаках 2009 года | Цена с НДС, бел. руб. в денежных знаках 2000 года | Общая стоимость с НДС, бел. руб. в денежных знаках 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|---|
| призы первого порядка | Смартфон PRESTIGIO PSP5502DUOWHITE | 19 | 180,00 | 3 420,00 | 1 800 000 | 34 200 000 |
| | денежные средства в размере | | 12,10 | 229,90 | 121 000 | 2 299 000 |
| | далее Приз 1.1 | | | | | |
| | Автомобильный компрессор Turbo AVS KE 350EL | 40 | 90,00 | 3 600,00 | 900 000 | 36 000 000 |
| | далее Приз 1.2 | | | | | |
| | ПЛАНШЕТНЫЙ ПК GINZZU GT-X870_WH | 50 | 265,00 | 13 250,00 | 2 650 000 | 132500 000 |
| | денежные средства в размере | | 24,80 | 1 240,00 | 248 000 | 12 400 000 |
| | далее Приз 1.3 | | | | | |
| призы второго порядка | СОТОВЫЙ ТЕЛЕФОН APPLE IPHONE 5S SPACE GRAY 16GB, MODEL A1457, FE43UA/A | 3 | 630,00 | 1 890,00 | 6 300 000 | 18 900 000 |
| | денежные средства в размере | | 79,34 | 238,02 | 793 400 | 2 380 200 |
| | далее Приз 2.1 | | | | | |
| | СОТОВЫЙ ТЕЛЕФОН APPLE IPHONE 5S GOLD 16GB, MODEL A1457, FE434UA/A | 4 | 630,00 | 2 520,00 | 6 300 000 | 25 200 000 |
| | денежные средства в размере | | 79,34 | 317,36 | 793 400 | 3 173 600 |
| | далее Приз 2.2 | | | | | |
| | СОТОВЫЙ ТЕЛЕФОН APPLE IPHONE 5S SILVER 16GB, MODEL A1457, FE434UA/A | 2 | 630,00 | 1 260,00 | 6 300 000 | 12 600 000 |
| | денежные средства в размере | | 79,34 | 158,68 | 793 400 | 1 586 800 |
| | далее Приз 2.3 | | | | | |
| | Парктроник AVS PS-524 U (4 датчика, цветной LCD-дисплей) | 12 | 86,00 | 1 032,00 | 860 000 | 10 320 000 |
| | далее Приз 2.4 | | | | | |
| | Видеорегистратор автомобильный AVS VR-810-A7 | 21 | 205,00 | 4 305,00 | 2 050 000 | 43 050 000 |
| | денежные средства в размере | | 15,84 | 332,64 | 158 400 | 3 326 400 |
| | далее Приз 2.5 | | | | | |
| | 181420 Ноутбук Dell Inspiron 11 Series 3162-9865 11.6'' PALMREST WHITE HD (1366X768) LED ANTIGLARE CELERON N3050 (UP TO 2.16 GHZ/2 MB), INTEL HD GRAPHICS 2 GB (1X2GB) DDR3L-1600 MHZ 32 BEMMC WLAN802/11 B/G/N+BLUETOOTH 4/0, WINDOWS 10 HOME (64 BIT)/CAMERA/MICROPHONE/HDMI 1/4A MEDIA CARD READER 1XUSB 3.0/2XUSB2/0/1.22 KG/2 CELL BATT/ ENGLISH-RUSSIAN KBD/ McAFEE 15 MONTH SUBSCRIPTION/ 1Y WARRANTY | 10 | 630,00 | 6 300,00 | 6 300 000 | 63 000 000 |
| | денежные средства в размере | | 79,34 | 793,4 | 793 400 | 7 934 000 |
| | далее Приз 2.6 | | | | | |
| | 181425 Ноутбук Dell Inspiron 11 Series 3162-9865 11.6'' PALMREST RED HD (1366X768) LED ANTIGLARE CELERON N3050 (UP TO 2.16 GHZ/2 MB), INTEL HD GRAPHICS 2 GB (1X2GB) DDR3L-1600 MHZ 32 BEMMC WLAN802/11 B/G/N+BLUETOOTH 4/0, WINDOWS 10 HOME (64 BIT)/CAMERA/MICROPHONE/HDMI 1/4A MEDIA CARD READER 1XUSB 3.0/2XUSB2/0/1.22 KG/2 CELL BATT/ ENGLISH-RUSSIAN KBD/ McAFEE 15 MONTH SUBSCRIPTION/ 1Y WARRANTY | 1 | 630,00 | 630,00 | 6 300 000 | 6 300 000 |
| | денежные средства в размере | | 79,34 | 79,34 | 793 400 | 793 400 |
| | далее Приз 2.7 | | | | | |
| | ПЛАНШЕТНЫЙ КОМПЬЮТЕР APPLE IPAD AIR 2 WI-FI CELLULAR 16GB GOLD, MODEL A1567, MH1C2TU/A | 6 | 1 409,00 | 8 454,02 | 14 090 000 | 84 540 200 |
| | денежные средства в размере | | 195,75 | 1 174,5 | 1 957 500 | 11 745 000 |
| | далее Приз 2.8 | | | | | |
| | ПЛАНШЕТНЫЙ КОМПЬЮТЕР APPLE IPAD AIR 2 WI-FI CELLULAR 16GB SPACE GRAY, MODEL A1567, MGGX2TU/A | 2 | 1 409,00 | 2 818,01 | 14 090 000 | 28 180 100 |
| | денежные средства в размере | | 195,75 | 391,5 | 1 957 500 | 3 915 000 |
| | далее Приз 2.9 | | | | | |

Призовой фонд игры в размере **54 434,37** (пятидесяти четырех тысяч четырехсот тридцати четырех рублей 37 копеек) в денежных знаках 2009, или **544 343 700** (пятисот сорока четырех миллионов трехсот сорока трех тысяч семисот) белорусских рублей в денежных знаках 2000 года формируется за счет имущества и денежных средств Организатора.

**9. Порядок участия в Игре.**
Для участия в Игре в период с 15 августа по 4 сентября 2016 года необходимо:
9.1. Иметь карту-брелок программы «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг»;
